

КУХНЯ — НАЦЫЯНАЛЬНАЯ, СТРАВЫ — СУСЕДСКІЯ 5

ХАТА НА ВЁСЦЫ: ДАГЛЯДАЦЬ ЦІ РУЙНАВАЦЬ? МС





Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родным мове

# ЗВЯЗДА

26 КАСТРЫЧНІКА 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 207 (28823)



9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TVПРАГРАМА


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір Краўцоў, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«У плане прафілактычнай работы недапушчальны фармальны падыход. Яшчэ адзначаюцца факты, калі неабходныя меры не прымаюцца, не забяспечваецца належны кантроль, а тыя ці іншыя мерапрыемствы не даводзяцца да канца. У Гродзенскай вобласці найменшыя паказчыкі загінулых на вытворчасці, але ў рэгіёне адзначаецца рост колькасці пажараў і выпадкаў гібелі людзей у іх. Нягледзячы на зніжэнне колькасці дарожна-транспартных здарэнняў, узрасла колькасць загінулых у іх людзей. Звяртаюць на сябе ўвагу і факты «п'янай» злачыннасці, знаходжання нецвярозых людзей на рабочым месцы. Таму прафілактычную работу неабходна актывізаваць, прымаць найбольш дзейсныя меры па ўмацаванні грамадскай бяспекі і дысцыпліны, зніжэнні гібелі і траўматызму людзей».*

# ГАРБУЗОВЫ ПАРАД



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На кірмашы ў Рэчыцы.

## КОРАТКА

- **Міністэрства працы і сацыяльнай абароны звярнулася ў «Беларусбанк» з просьбай разгледзець магчымасць вызваліць ад выплаты камісіі за прыём плацяжоў наяўнымі за некаторыя сацыяльныя паслугі.**
- Амаль палову даходаў бюджэту Гродзенскай вобласці (49,7 % ці BYN835 млн) з пачатку года забяспечылі 11 буйных падаткаплацельшчыкаў.
- **Тыя, хто прайшоў тэрміновую службу ў войску, могуць атрымаць ільготы пры паступленні ў ВНУ і ССНУ.**
- Урачыстая цырымонія гашэння паштовай маркі «100 гадоў камсамолу» прайшла ўчора ў Нацыянальным мастацкім музеі ў Мінску.


ISSN 1990 - 763X


На варце здароўя

## ВЫЯВІЦЬ СХАВАНАЕ ДАПАМАГАЕ РАДЫЯЛОГІЯ

### Спецыялісты з усяго свету абмяркоўваюць у Мінску развіццё прамянёвай дыягностыкі

**Гэтымі днямі ў сталіцы праходзіць першы кангрэс Беларускага таварыства радыёлагаў, якое аб'ядноўвае каля 300 спецыялістаў рэнтгеналогіі, магнітарэзананснай тамаграфіі, ультрагукавой дыягностыкі, радыеізатопнай дыягностыкі і традыцыйнай радыялогіі. У кангрэсе бяруць удзел спецыялісты з усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама з Расіі, Харватыі, Італіі, Аўстрыі, ЗША, Турцыі, Сербіі, Францыі, Украіны.**


СТАР. 4




Фота БелТА.

Праблема

## СМЕТНІК У ГОРАДЗЕ

### У Магілёве актывіст змагаецца за чысціню навакольнага асяроддзя

**Віталь Гардзееў для жыхароў магілёўскай Чапаеўкі — бясспрэчны аўтарытэт. Ён — старшыня вулічкама № 5 Ленінскага раёна Магілёва і член Савета тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання мікразоны № 4 і не прывык да таго, каб на яго ўчастку быў бардак. Актывіст дамогся, каб на замацаванай за ім тэрыторыі гарадскія ўлады навялі парадак з дарогамі і электрычнымі слупамі. А нядаўна патэлефанаваў у рэдакцыю «Звязды» і папрасіў дапамогі ў барацьбе з несанкцыянаваным сметнікам у межах горада.**

Разам з няўрымслівым актывістам рушым на тое самае месца, каб ацаніць абстаноўку. Гэта зусім побач з ліцэем № 9, які знаходзіцца на цэнтральнай вуліцы Першамайскай за некалькі прыпынкаў ад чыгуначнага вакзала. Ліцэй якраз каля дарогі і, здаецца, павінен утрымліваць сваю тэрыторыю ў выключным стане. Ну вось, я так і думала, каля будынка шчыруюць хлопцы і дзяўчаты, прыбіраюць лістоту. Але Васіль Гардзееў наадварот, настроены не так аптымістычна. «Пойдзем, паглядзім, куды яны яе панясуць», — кліча ён кудысьці на задворкі ліцэя. І сапраўды. Каля будынка, які нагадвае прыбіральню, бачым свежавыкапаную яму. Менавіта туды метадычна і зносіцца лістота. «Ну вось, бачыце, зноў рыхтуюцца пахаваць смецце на нейтральнай тэрыторыі», — перажывае мой спадарожнік.


СТАР. 4

# І КАБІНЕТ, І ПОЛЕ, І СТАНОК

## Урад павінен займацца рэальным сектарам эканомікі

**Аб гэтым заявіў Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з першым намеснікам прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Турчыным.**

У пачатку сустрэчы кіраўнік дзяржавы адзначыў два пытанні, якія неабходна абмеркаваць.

«Калі мы абнаўлялі склад урада, мы дамаўляліся, што ў найбліжэйшы час вы разберацеся з функцыянальнымі абавязкамі членаў урада, апаратам урада і структурай, — нагадаў беларускі лідар. — Я прасіў вас заняцца перш за ўсё гэтым пытаннем, паколькі лепш за вас у гэтым ніхто не разбярэцца — вы кіравалі апаратам урада. Каму як не вам цяпер, улічваючы магчымыя недапрацоўкі, недахопы ў арганізацыі работы ўрада ў мінулым, выправіць сітуацыю».

Прэзідэнт папрасіў першага намесніка прэм'ер-міністра агучыць бачанне некаторых пытанняў. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў, што ўрад — гэта калегіяльны орган. І рашэнні там прымаюцца калектыўна. «Гэта павінна свята выконвацца, я гэтаму надаю вельмі вялікую ўвагу», — сказаў беларускі лідар.

Акрамя таго, Прэзідэнт адзначыў, яму паступаюць сігналы, што ўрад бачыць сваю работу па-свойму: маўляў, будзе займацца стратэгіяй, а не паўсядзённымі справамі. «Урад будзе займацца не толькі выпрацоўкай стратэгіі. Гэта, дарэчы, не ваша прэрагатыва, стратэгія ў нас выпрацавана, яна вызначаецца Прэзідэнтам, уносіцца на галасаванне на прэзідэнцкіх выбарах і зацвярджаецца Усебеларускім народным сходам», — нагадаў Прэзідэнт.

«Магчымыя нейкія карэктывы, — звярнуў увагу беларускі лідар. — Ураду ніхто не забараняе ўносіць прапановы па карэктывах, але рашэнні прымае Прэзідэнт. Урад Беларусі заўсёды займаўся і рэальным сектарам эканомікі, і іншымі пытаннямі. Таму прыйдзецца рабіць усё: і гной вывозіць на палі, і сеяць, і ўбіраць, і каля станка стаяць, і тэхналогіямі займацца».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: урад, які будзе сядзець у канторы і выпрацоўваць нейкую стратэгію, не разумеючы, што адбываецца ўнізе, у Беларусі не патрэбны.

Другое пытанне сустрэчы — гэта развіццё ІТ-сферы і лічбавізацыя беларускай эканомікі і краіны ў цэлым. Прапановы па гэтым кірунку былі розныя і зыходзілі ў асноўным ад непасрэдных прадстаўнікоў ІТ-сферы. «Ствараць ледзь не асобны ўрад па лічбавізацыі краіны, потым стварыць міністэрства лічбавізацыі... Мы ўжо шмат працуем над развіццём ІТ-сферы, — канстатаваў беларускі лідар. — І пачалося даўно, яшчэ, калі мы стваралі Парк высокіх тэхналогій, вопыт напрацоўвалі. Сёння гэтага вопыту дастаткова для таго, каб здзяйсняць чарговыя крокі ў развіцці нашага не толькі ІТ-парка, але лічбавізацыі ўсёй нашай Беларусі».

Прэзідэнт дадаў, што будучыня нашай краіны — не толькі ў рэальным сектары эканомікі. Вельмі многае для развіцця дзяржавы і дабрабыту народа можна ўзяць з ІТ-сферы. Пры гэтым ён адзначыў, што ад рэальнага сектара ўсё роўна нікуды не сысці — лічбавізацыя забяспечыць яго больш эфектыўную працу. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ў Аляксандра Турчына, на якім узроўні знаходзіцца наша краіна, што ў найбліжэйшы час неабходна распачаць.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што Аляксандру Турчыну неабходна разам з ІТ-спецыялістамі падрыхтаваць параду ў Прэзідэнта. І ўжо на ёй, прапрацаваўшы і абмеркаваўшы гэтыя пытанні загадзя, будуць прыняты неабходныя рашэнні.

У адказ намеснік прэм'ер-міністра нагадаў пра поспехі Парка высокіх тэхналогій: у гэтым годзе прырост склада зе 400 мільёнаў долараў выручкі.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

### Каментарый у тэму

У першым квартале 2019 года будзе падрыхтавана маштабная (у плане мэт і задач, а не колькасці ўдзельнікаў) нарада з удзелам Прэзідэнта па развіцці лічбавай эканомікі ў Беларусі — аб гэтым расказаў журналістам першы намеснік прэм'ер-міністра Аляксандр Турчын па выніках нарады ў Прэзідэнта. У ёй прымуць удзел кіраўнікі тых галін, у якіх перш за ўсё неабходная лічбавізацыя, — сацыяльная сфера, ахова здароўя, адукацыя, ключавыя галіны эканомікі, прадстаўнікі ІТ і рэзідэнты Парка высокіх тэхналогій.

На яго думку, прырост ІТ-сферы на 400 мільёнаў долараў — гэта самая нізкая мяжа, ва ўрадзе разлічваюць на большы вынік. Гэта лічба ўключае і выручку, і прырост экспарту паслуг. «Сёння ІТ-сферу трэба разглядаць не як нейкі анклаў у краіне з нейкімі льготнымі ўмовамі, а як ужо стваранне цэлай галіны ў эканоміцы», — дадаў Аляксандр Турчын.

Паводле слоў першага намесніка прэм'ер-міністра, дабаўленая вартасць выручкі ў сферы камп'ютарных паслуг складае 90 %. Тут жа трэба ўлічваць, што ў сферы ў цяперашні час занята больш за 30 тысяч чалавек з сярэдняй зарплатай больш чым чатыры тысячы беларускіх рублёў.

Што датычыцца пытанняў, якія задаваў Аляксандр Лукашэнка адносна структуры ўрада, то тут Аляксандр Турчын адзначыў, што ёсць пэўныя напрацоўкі, аб якіх было дакладзена, у найбліжэйшы час яны будуць фармалізаваны.

На нарадзе ўзнімаўся і цэлы шэраг іншых пытанняў, напрыклад, па развіцці транспартна-лагістычнай сістэмы. Яшчэ былі абмеркаваны дакументы, якія датычацца прадпрымальніцтва, — яны таксама ў хуткім часе пасля дэталёвай прапрацоўкі будуць агучаны.

Па словах Аляксандра Турчына, з улікам кадравых прызначэнняў паўстала таксама неабходнасць абнавіць склад Савета па развіцці прадпрымальніцтва. «Пакуль на пасадзе старшыні буду працаваць я», — паведаміў Аляксандр Турчын.

# Найвышэйшы ўзровень форуму

**Сёння ў пленарным пасяджэнні І Форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны прыме ўдзел Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Чакаецца, што мерапрыемства таксама наведае Прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка. Да ўдзелу і выступленняў на асноўнай пляцоўцы форуму кіраўнікі дзяржаў правдуць сустрэчу ў фармаце сам-насам. Галоўны акцэнт у ходзе перагавораў будзе зроблены на пытаннях развіцця гандлю, эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва дзвюх краін праз прызму патэнцыялу прамых кантактаў на ўзроўні рэгіёнаў. Па выніках форуму чакаецца падпісанне шэрага дакументаў і заключэнне дамоўленасцяў, накіраваных на пашырэнне супрацоўніцтва па ўсім спектры кірункаў беларуска-ўкраінскага ўзаемадзеяння.

# Міжрэгіянальныя стасункі спрашчаюць узаемадзеянне

**Учора, у першы дзень форуму, прайшло пасяджэнне беларуска-ўкраінскага кансультатыўнага савета дзелавога супрацоўніцтва і перамовы кампаній дзвюх краін.**

Разгледжана павелічэнне ўзаемнай прысутнасці на рынках сельскагаспадарчай, харчовай і іншай прадукцыі. Вядучыя беларускія і ўкраінскія кампаніі дэманструюць распрацоўкі ў сферах машынабудавання і нафтахіміі, транспарту і лагістыкі, сельскай гаспадаркі і харчавання, лёгкай прамысловасці, турызму.



Старшыня Запарожскай абласной дзяржаўнай адміністрацыі Канстанцін БРЫЛЬ і старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК падчас падпісання пагаднення аб міжрэгіянальным супрацоўніцтве.

Падчас афіцыйнай сустрэчы кіраўнікоў абласцей Беларусі і Украіны ў Гомелі старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік адзначыў, што знешнегандлёвы абарот рэгіёна з Украінай штогод павялічваецца амаль на чвэрць, за 25 гадоў супрацоўніцтва дакументы аб міжрэгіянальным узаемадзеянні падпісаны з 8 абласцямі Украіны:

— За апошнія сем гадоў у эканоміку Гомельскай вобласці з боку суседкі паступіла больш за 70 мільёнаў долараў прамых інвестыцый. Сёння ў Беларусі дзейнічае 290 прадпрыемстваў з украінскім капіталам, з якіх амаль 40 % — на тэрыторыі нашай вобласці. Частка з іх — рэзідэнты СЭЗ «Гомель-Ратон».

Сярод перспектыўных сумесных праектаў — стварэнне новага транспартнага калідора па Дняпры. Размова ідзе пра будаўніцтва ў вёсцы Ніжнія Жары Брагінскага раёна партовага тэрмінала. Таксама падчас сустрэчы ішла гаворка пра стварэнне ў Мазырскім раёне вытворчасці па нанясенні палімернага пакрыцця на металічныя паверхні.

— Міжрэгіянальныя стасункі дазваляюць значна палепшыць работу паміж рэгіёнамі, — адзначыў Уладзімір Дворнік. — Не толькі ў пытаннях гуманітарных, але самае галоўнае — у эканоміцы. Сёння кожная краіна абараняе свайго вытворцу, таму часам з'яўляюцца нейкія эканамічныя перашкоды. Калі мы збіраемся на такім узроўні, як на гэтым форуме, мы знаходзім паразуменне і развязваем вузлы, што перашкаджалі плённаму супрацоўніцтву.

На сустрэчы кіраўнікоў абласцей Беларусі і Украіны ў Гомелі былі падпісаны тры дакументы. Гэта пагадненне аб міжрэгіянальным супрацоўніцтве паміж Гомельскім аблвыканкамам і Запарожскай абласной дзяржаўнай адміністрацыяй, мемарандум аб супрацоўніцтве з Кіеўскай абласной дзяржаўнай адміністрацыяй. Таксама Магілёў і горад Паўднёвае Адэскай вобласці падпісалі дамову аб пабрацімскіх сувязях. Яшчэ некалькі дакументаў, якія датычацца міжрэгіянальнага супрацоўніцтва, будуць падпісаны ў другі дзень Форуму рэгіёнаў Беларусі і Украіны.

Да таго ж, у гэтыя дні ў Гомелі можна пазнаёміцца з прадукцыяй больш як 140 вытворцаў рэгіёнаў Беларусі і Украіны. На галоўнай плошчы горада над Сожам праходзіць прэзентацыя тэхнікі беларускіх прамысловых гігантаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Акцэнты

Андрэй РАЎКОЎ:

# «АПТЫМІЗАЦЫЯ — ПРЫЯРЫТЭТ БУДАЎНІЦТВА БЕЛАРУСКАЙ АРМІІ»

**Аптымізацыя баявога і колькаснага складу Узброеных Сіл (УС) з'яўляецца прыярытэтным кірункам будаўніцтва беларускай арміі да 2020 года. Аб гэтым заявіў міністр абароны Беларусі Андрэй Раўкоў у час сустрэчы з кіраўнікамі рэспубліканскіх СМІ. Семінар з кіраўнікамі рэспубліканскіх сродкаў масавай інфармацыі праходзіць на базе 51-й гвардзейскай артылерыйскай брыгады ў Асіповічах, перадае БелТА. Прысвечаны ён сучаснаму стану і перспектывам развіцця Узброеных Сіл Беларусі.**

«Прыярытэтным кірункам будаўніцтва беларускай арміі да 2020 года з'яўляецца, па-першае, аптымізацыя баявога складу і колькасці Узброеных Сіл. Па-другое, выбарачнае пераўзбраенне войскаў на сучасныя ўзоры ўзбраення і ваеннай тэхнікі. Па-трэцяе, утылізацыя і рэалізацыя незапатрабаваных ва УС узораў узбраення, ваеннай тэхнікі, боепрыпасаў і матэрыяльных сродкаў, аптымізацыя месцаў іх захоўвання, перадача вызваляемых гарадкоў мясцовым органам улады, а таксама захаванне кадравага патэнцыялу і павышэнне ўзроўню ўкамплектаванасці Узброеных Сіл», — сказаў Андрэй Раўкоў.

Пры аптымізацыі баявога і колькаснага складу вялікая ўвага ўдзяляецца павелічэнню колькасці баявога кампанента, удасканаленню арганізацыйна-штатных структур органаў кіравання, аб'яднанняў, злучэнняў і воінскіх часцей. «За апошнія тры гады колькасць арміі не змянілася і знаходзіцца ў межах, вызначаных кіраўніком дзяржавы, — каля 65 тысяч чалавек. Разам з гэтым за кошт скарачэння забеспячальнага кампанента нам удалося істотна павялічыць склад і скарацiць тэрміны гатоўнасці падраздзяленняў, здольных неадкладна рэагаваць на любыя выклікі і пагрозы ваеннай бяспекі дзяржавы, — адзначыў міністр абароны. — Ідзе пазбаўленне ад дублюючых і другасных структур. Пры гэтым не дапушчана зніжэння баявых магчымасцяў злучэнняў і воінскіх часцей, а таксама росту сацыяльнай напружанасці ў воінскіх калектывах. Укамплектаванасць сучаснымі ўзорамі ўзбраення і ваеннай тэхнікі ўжо сёння патрабуе ад салдата вельмі высокай кваліфікацыі, сярэдняй адукацыі ўжо часам недастаткова».

Андрэй Раўкоў адзначыў, што ў сучаснай арміі мяркуецца шырокае выкарыстанне навукаёмістых, у тым ліку ІТ-тэхналогій. «Інтэлектуальны патэнцыял Беларусі велізарны. Шмат у чым ён ствараецца маладымі людзьмі, якія працуюць у сферы інфармацыйных тэхналогій. Праз месяц у ходзе чарговага прызыву будзе сфарміравана на базе Ваеннай акадэміі новае падраздзяленне — рота інфармацыйных тэхналогій. Там будуць праходзіць ваенную службу маладыя людзі, якія маюць вышэйшую тэхнічнае адукацыю па ІТ-спецыяльнасці», — сказаў міністр абароны.

Рота сумесна з падраздзяленнямі Ваеннай акадэміі і іншымі навуковымі і навучальнымі ўстановамі будзе займацца распрацоўкай праграмнага забеспячэння, спецыяльных і прыкладных праграм. «Пры гэтым маладыя людзі, якія ў адпаведнасці з заканадаўствам прызываюцца на тэрміновую ваенную службу, змогуць максімальна ўдасканальваць свае прафесійныя навыкі як спецыялісты ў галіне інфармацыйных тэхналогій», — падкрэсліў Андрэй Раўкоў.

# ЗА РОЎНЫЯ ПРАВЫ

**Прадстаўнікі розных краін сабраліся на два дні ў Мінску, каб абмеркаваць цяжкасці, з якімі сутракаюцца жанчыны ў жыцці і на працы. Сесіі Міжнароднага форуму жанчын-лідараў прысвечаны ролям у палітыцы і эканоміцы, роўным магчымасцям ва ўніверсітэтах і іншым тэмам.**

**Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны,** абмалявала партрэт сярэднестатыстычнай беларускай жанчыны: 42 гады, з вышэйшай адукацыяй, гарадскі жыхар, займаецца спортам, актыўны IT-карыстальнік. У 26 гадоў упершыню ўступае ў шлюб, першае дзіця — у 27. Дарэчы, Беларусь уваходзіць у першую трыццатку краін па індэксе гендарнага разрыву (сярод 144 краін) — ён ацэньвае раўнапраўе палоў.

Для таго каб максімальна выкарыстоўваць патэнцыял жанчыны, на думку міністра, неабходна скараціць двайную занятасць: у сем'ях з дзецьмі да 10 гадоў жанчына аддае ў 2,5 раза больш часу на дамашнюю працу і догляд за малымі, чым мужчына. «Мы павінны падняць ролю мужчыны ў сям'і, і перш за ўсё — прэстыж бацькоўства», — рэзюмавала Ірына Касцевіч.

**Андрэй ДАПКЮНАС, намеснік міністра замежных спраў Беларусі,** сімвалічна з'явіўся на форуме ў аранжавым гальштуку — ён сімвалізуе барацьбу з гвалтам з жанчын і растлумачыў: «Дзесяць гадоў таму Генеральны сакратар ААН распачаў кампанію Unite — аб'яднацца, каб спыніць гвалт у дачыненні да жанчын. У рамках гэтай кампаніі з'явілася ідэя прыцягваць увагу сусветнай грамадскасці да абароны жанчын ад гвалту не толькі раз на год (25 лістапада адзначаюць Міжнародны дзень барацьбы з гвалтам у адносінах да жанчын. — **Заўв. «Зв».**), але штомесяц менавіта на 25-ы дзень. Па задуме аўтараў гэтай кампаніі, аранжавы колер сваёй яркасцю і аптымістычнасцю ўвасабляе будучыню, вольную ад гвалту ў дачыненні да жанчын і дзяўчат. І, дарэчы, набліжэнне такой будучыні ёсць адзін з тэматычных акцэнтаў гэтага форуму».

**Вольга ПЕТРАШОВА, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па міжнародных справах і старшыня пярвічнай арганізацыі Беларускага саюза жанчын у ніжняй палаце парламента,** лічыць натуральным, што многія жанчыны абіраюць палітычную дзейнасць, паколькі маюць адпаведную адукацыю, амбіцыі і жаданне рэалізаваць свае магчымасці. Дэпутат адзначыла, што наша краіна зрабіла значны прарыў па паляпшэнні становішча жанчын, аднак падкрэсліла, што пабудаванне збалансаванай гендарнай палітыкі — працэс доўгатэрміновы. Гендарная роўнасць патрабуе далейшых мэтанакіраваных намаганняў і ўдасканальвання.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

## СПРАВІЦЦА З АГУЛЬНЫМІ ПРАБЛЕМАМІ

**Як заўсёды, у гэтую суботу, 27 кастрычніка з 9.00 да 12.00 Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць прамыя тэлефонныя лініі.**

На гэты раз іх праведуць:

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама АЛЬШЭЎСКІ Вадзім Іванавіч, тэл. 8 016 221 31 21;

першы намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч, тэл. 8 021 222 22 22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама ГАРБАЧОЎ Уладзімір Уладзіміравіч, тэл. 8 023 233 12 37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч, тэл. 8 015 273 56 44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама КУНЦЭВІЧ Андрэй Міхайлавіч, тэл. 8 022 250 18 69;

кіраўнік спраў МІНСКАГА аблвыканкама ГУРЫНОВІЧ Уладзімір Аляксандравіч, тэл. 8 017 500 41 60;

кіраўнік спраў МІНСКАГА гарвыканкама МАЦЕЛЬСКАЯ Ганна Мар'янаўна, тэл. 8 017 222 44 44

## ЯШЧЭ РАЗ ПРА ПАДАТКІ

**Новую рэдакцыю Падатковага кодэкса абмеркавалі на пасяджэнні Савета па развіцці прадпрымальніцтва. Да таго ж прадметная размова атрымалася па другім пытанні — удасканальванне прававых умоў фарміравання маёмаснай базы для вядзення бізнесу.**

Прапановы па падатках растлумачыла Жанна Тарасевіч, дырэктар Бізнес-саюза прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя прафесара М. С. Куняўскага. Яна пракаментавала, што новую рэдакцыю Падатковага кодэкса бізнес-супольнасць вітае. Шмат было падтрымана з таго, што прапаноўвалі прадпрымальнікі. Аднак застаюцца некаторыя пытанні, з якімі неабходна яшчэ папрацаваць, як, напрыклад, павышальны каэфіцыент. На думку Жанны Тарасевіч, яго неабходна зніжаць ці ўвогуле паэтапна адмяняць. З гэтым пагадзіўся і Аляксандр Турчын, першы намеснік прэм'ер-міністра і старшыня Савета па развіцці прадпрымальніцтва. Яшчэ па-за ўвагай рабочай групы засталіся непадатковыя плацяжы. У выніку, каб разабрацца з усімі пытаннямі, было вырашана рабочую групу захаваць.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

Фестывалім

## УРА! АНІМАЁЎКА!

**Сёння ў Магілёве пачынаецца любімы для дзяцей і дарослых фестываль мультыплікацыйных фільмаў.**

У горад прыехалі аўтарытэтныя стваральнікі мультыплікацыйных стужак і ўсе тыя, хто не ўяўляе сабе жыцця без гэтага цудоўнага мастацтва. На працягу трох дзён будуць ісці паказы мультфільмаў, ладзіцца сустрэчы з любімымі рэжысёрамі, мастакамі і акцёрамі, праводзіцца майстар-класы і конкурсы.

На фестываль «Анімаёўка 2018» было прадстаўлена 404 фільмы (дарэчы, летась іх было 240) з 47 краін свету. Упершыню ўздел у гэтым мерапрыемстве бяруць Албанія, Коста-Рыка, Сербія. Для спаборніцтва ў конкурсе анімацыйных фільмаў адабрана 61 стужка. Імёны пераможцаў агучыць аўтарытэтнае міжнароднае журы на чале з класікам мультыплікацыйнага жанру Леанідам Носаравым. Дыпломы фестывалю і сімвал свята «Вялікі хрустальны аловак» атрымаюць самыя лепшыя ў 10 намінацыях. Плюс адзін з анімацыйных фільмаў стане стужкай года і атрымае Гран-пры. Асобна ўзнагародзяць юныя таленты.

У праграме шмат карысных сустрэч, дзе прафесіяналы падзеляцца, як ствараць мультыплікацыйныя фільмы, «ажывіць» казку, зрабіць пластылінавы мульцік . Сярод гасцей фестывалю — аўтары песень для мультфільмаў і мультсерыялаў «Смяшарыкі», «Малышарыкі», «Лятаючыя звяры» «Ціма і Тома» Марына Ланда і Сяргей Васільеў.

Нагадаем, што арганізатарамі фестывалю «Анімаёўка 2018» выступаюць Міністэрства культуры Беларусі і Магілёўскі аблвыканкам. Дарэчы, праводзіцца ён ужо 21-ы раз.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Запрашальнік

## ВЕЧАР УСПАМІНАЎ АД «ЯГАДКІ»

**Спявачка, тэлевядучая і шматдзетная мама Ларыса Грыбалёва запрашае людзей з добрай памяццю адзначыць юбілей адной з самых рэйтынгавых перадач 90-х «Усё нармальна, мама!».**




На творчым вечары, які адбудзецца ў фармаце тэлевізійных здымак 30 лістапада на пляцоўцы Prime Hall, артыстка і стваральнікі праграмы абяцаюць успомніць найлепшыя рубрыкі і гумарыстычныя сцэнкі, а таксама выканаць любімыя песні. «Шмат інтэрактыву і ўвесь гэты рок-н-рол я вам абяцаю», — інтрыгуе спявачка.

Ларыса Грыбалёва вырашыла сумясціць прыемнае з яшчэ больш прыемным і адначасова адсвяткаваць уласнае 45-годдзе, да якога з задавальненнем робіць і прымае падарункі. Так, праз краўдфандынгавую пляцоўку ulej.by можна замовіць білет на канцэрт, арыгінальную футболку з хэштэгам #ягадка, аўтарскі кактэйль «Усё нармальна, мама!» і фота за кулісамі, рынгтон загалоўнай песні праграмы або сняданак у кампаніі з артысткай, і мноства іншых цікавых рэчаў. «Магчыма, гэта банальна, але ў дзень нараджэння я хачу, каб хто-небудзь арганізаваў і для мяне свята, сюрпрыз ад і да», — прызнаецца Ларыса.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## У МІНСКУ ПРАЙШОЎ «ЗАЛАТЫ КЕЛІХ»

**У конкурсе прынялі ўдзел вядучыя вытворцы і дыстрыб'ютары алкагольнай і безалкагольнай прадукцыі з Беларусі, Расіі, Малдовы, Славакіі, Венгрыі, Грузіі і іншых краін.**

У журы і экспертны савет конкурсу ўвайшлі прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, спецыялізаваных навуковых устаноў, рытэйлу, эксперты вытворчасці алкагольнай прадукцыі, спецыялісты ў сферы навукі, маркетынгу, рэкламы, прасоўвання, брэндынгу і дызайну. **Намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай акадэміі навук па харчаванні Алена МАРГУНОВА** заявіла, што нашы распрацоўшчыкі падалі на разгляд журы конкурсу беларускія каньякі з мясцовых вінаматэрыялаў, а таксама айчыннае віскі. Праўда, зараз такая прадукцыя называецца не віскі, а спіртны напой з высакаякаснага збожжавага дыстылятара.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Амерыканскі рынак абваліўся




Індэкс NASDAQ Composite, які разлічваецца аднайменнай біржай у ЗША, упаў на 4,43 працэнта па выніках учарашніх таргоў, вынікае з даных гандлёвай пляцоўкі. Гэта найгоршы паказчык са жніўня 2011 года. На працягу ўсёй гандлёвай сесіі значэнне індэкса моцна вагалася і да канца дня склала 7109,40 пункта. Пры адкрыцці значэнне раўнялася 7423,21 пункта. У лютым гэтага года індэкс губляў 3,8 працэнта за адзін гандлёвы дзень. Таксама па выніках 24 кастрычніка знізілася значэнне і іншых індэксаў ЗША: Dow Jones (мінус 2,41 працэнта), S & P 500 (3,09 працэнта). Аналітыкі звязваюць такія вынікі са статыстыкай рынку нерухомасці, апублікаванай міністэрствам гандлю. Згодна з ёй, продажы новабудоўляў у краіне ў верасні скараціліся на 5,5 працэнта. Як вядома, на біржы NASDAQ гандлююцца акцыі высокатэхналагічных кампаній, у тым ліку Tesla, Apple і Microsoft. Днямі Bloomberg, спасылаючыся на разлікі JPMorgan, прадказаў амерыканскай эканоміцы ўступленне ў рэцэсію.

### На Кубань абрынуліся магутныя ліўні



Праліўныя дажджы абрынуліся на Туапсінскі і Апшэронскі раёны Кубані, а таксама Лазараўскі раён Сочы. За некалькі гадзін там выпала месячная норма ападкаў. У 27 населеных пунктах аказаліся падтопленыя 1,6 тысячы жылых дамоў. На федэральнай трасе А-147 Джугба — Сочы з-за паводкі паваліўся 20-метровы ўчастак моста цераз раку Макопсе, які размешчаны ў Лазараўскім раёне. У выніку здарэння ніхто не пацярпеў. Пачаць аднаўляць мост пакуль не могуць — перашкаджае непагадзь. Акрамя таго, у раёне населеных пунктаў Ашэ і Савет-Кваджэ на федэральную трасу сышлі селі. Ад прыбярэжнай часткі адрэзаныя населеныя пункты Мар'іна, Наджыго, Калеж і Лыготх. Перапынены і чыгуначныя зносіны. Ёсць загінулыя. Усе службы пераведзены на кругласутачны рэжым работы. Сёння працягвае дзейнічаць штармавое папярэджанне, на тэрыторыі Сочы чакаюцца моцныя дажджы з навальніцамі, градам і ўзмацненнем ветру да 22 метраў за секунду. Магчымы рэзкі ўздым узроўню вады ў рэках на асобных вадатоках з дасягненнем неспрыяльных адзнак, узрастае рызыка сходу селяў у горнай зоне, на ўчастку Магры — Вясёлае існуе небяспека фарміравання смерчаў над морам.

### Новы «Тытанік» адправіцца ў рэйс



Копія знакамітага судна «Тытанік», якая распрацавана кампаніяй Blue Star і атрымала назву «Тытанік II», здзейсніць свой першы рэйс у 2022 годзе. Пра гэта піша USA Today. Лайнер зможа прыняць на борт 2400 пасажыраў і амаль 900 членаў экіпажа — амаль столькі ж, колькі было на караблі ў 1912 годзе, падчас яго першага і апошняга рэйса. Стваральнікі паабяцалі ўлічыць памылкі «арыгінала» і забяспечыць судна дастатковай колькасцю шлюпак і выратавальных камізэлек. Новы «Тытанік» ажыццявіць двухтыднёвае падарожжа з Дубая ў Саўтгемптан і толькі затым адправіцца па класічным маршруце ў Нью-Ёрк. Калі першы рэйс акажацца паспяховым, судна будзе здзяйсняць кругасветнае падарожжа. Раней ініцыятар праекта, аўстралійскі мільярдэр Клайв Палмер, заявіў пра намер зняць на яго борце новы фільм, прысвечаны катастрофе.

Ну і ну!

## ЗДАЎ У ЛАМБАРД ТЭЛЕВІЗАР ЗНАЁМАЙ

### І пачаставаў пацярпелую на атрыманыя грошы

**Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Ленінскага РУУС сталіцы затрымалі 41-гадовага жыхара мікрараёна Серабранка, які ў сваёй знаёмай з кватэры выкраў тэлевізар «Гарызонт». А на выручаныя грошы потым... пачаставаў пацярпелую спіртным.**

У ходзе разбору было ўстаноўлена, што 27-гадовая мінчанка запрасіла ў госці свайго знаёмага, каб выпіць. Мужчына прыйшоў у абумоўлены час, аднак гаспадыні дома не было, а дзверы кватэры былі адчынены. Скарыстаўшыся гэтым, ён загарнуў у прасціну тэлевізар і вынес яго. Выкрадзеную тэхніку зламыснік здаў у ламбард за 60 рублёў. Грошы патраціў на спіртныя напоі і распіваў іх у далейшым з пацярпелай, якая, натуральна, ні пра што не падазравала. За крадзеж мужчына можа атрымаць да чатырох гадоў пазбаўлення волі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надвор'е

# ДОЖДЖ І ПЕРШЫ МОКРЫ СНЕГ...

## А на наступным тыдні ўначы ўжо ўпэўнены мінус

**У гэтыя выхадныя дні чакаецца паасенняму няўстойлівае надвор'е з тэмпературным фонам, блізкім да кліматычнай нормы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Сёння днём умовы надвор'я на тэрыторыі краіны будуць вызначаць атмасферныя франты, якія змяшчаюцца з Заходняй Еўропы. Таму днём пераважна па ўсходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі (дождж, магчымы мокры снег). Максімальная тэмпература паветра будзе 4—10 цяпла. А вось у суботу чарговая сістэма атмасферных франтоў абумовіць на большай частцы тэрыторыі краіны кароткачасовыя дажджы, уначы і раніцай па паўночным усходзе з мокрым снегам. Удзень дажджы будуць суправаджацца парывістым ветрам. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—6 цяпла, толькі па ўсходзе краіны панізіцца да нуля — мінус 2 градусаў. Удзень будзе ад плюс 5 градусаў па поўначы да 13 цяпла па поўдні краіны.

На наступны дзень, у нядзелю, уначы і раніцай па паўночным усходзе атмасферны фронт абумовіць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, захаваецца парывісты вецер. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да плюс 5 градусаў. Удзень пад уплывам чарговага фронту, які змяшчаецца з Карпат, месцамі, пераважна па паўднёвым захадзе Беларусі, пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вечарам па краіне магчымы мокры снег. Тэмпература паветра ўдзень будзе 2—8 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня атмасферны фронт, які змяшчаецца з тэрыторыі Украіны, абумовіць пагаршэнне ўмоў надвор'я. У панядзелак у многіх раёнах краіны чакаюцца ападкі (мокры снег, дождж), месцамі моцныя ападкі. Яны будуць суправаджацца парывістым ветрам, уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ў асноўным ад нуля да плюс 5 градусаў, па поўначы краіны панізіцца да мінус 1 — мінус 4 градусаў. Удзень будзе 1—8 цяпла, у паўднёвых раёнах — да плюс 12 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ВЫЯВІЦЬ СХАВАНАЕ ДАПАМАГАЕ РАДЫЯЛОГІЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па апошніх звестках, штогод у Беларусі праводзіцца каля 25 мільёнаў лячэбна-дыягнастычных прамянёвых даследаванняў, з іх каля 15 % складаюць высокатэхналагічныя метады. А паводле слоў **доктара медыцынскіх навук, кіраўніка Беларускага таварыства радыёлагаў, галоўнага ўрача Рэспубліканскага клінічнага медыцынскага цэнтра Кіраўніцтва справамі прэзідэнта Ірыны АБЕЛЬСКАЙ,** 80 % дыягназаў, па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, ставіцца з дапамогай радыелагічных метадаў даследавання.

— Радыялогія ў нас развіваецца вельмі актыўна. Сёння нават людзі, далёкія ад медыцыны, добра ведаюць, што такое абследаванне на камп'ютарным тамографе, ультрагукавая дыягностыка, магніта-рэзанансная тамаграфія. У нас ёсць свае сучасныя напрацоўкі, навуковы патэнцыял. За апошнія пяць-сем гадоў нашы спецыялісты атрымалі 28 патэнтаў і 22 аўтарскія пасведчанні на вынаходніцтвы. Беларускія радыёлагі працягваюць работу ў 10 праграмах навуковых даследаванняў, імі выдадзена 13 манаграфій, 38 навукова-метадычных дапаможнікаў і практычных дапаможнікаў для ўрачоў. Нам ёсць чым падзяліцца з замежнымі калегамі. У сваю чаргу спікеры з Еўрапейскай асацыяцыі радыёлагаў данясуць самую сучасную інфармацыю для пашырэння ведаў і практычных магчымасцяў нашых спецыялістаў. Так што чакаем ад гэтага форуму вялікага практычнага выніку, — падкрэсліла Ірына Абельская.

Таксама кіраўнік Беларускага таварыства радыёлагаў дадала, што на форуме будзе разгледжана развіццё адукацыйных праграм, стварэнне нацыянальных школ радыялогіі, што дазволіць падзяліцца перадавым вопытам з рэгіёнамі, праводзіць там тэматычныя занялкі, семінары, вэбінары.

— Сёння варта больш сур'ёзна ставіцца да развіцця тэлерадыялогіі (перадача на адлегласць медыцынскіх дыягнастычных выяў. — **Аўт.**), гэта вельмі сучасны метад давядзення інфармацыі да нашых калег, — адзначыла Ірына Абельская.

**Міністр аховы здароўя Валерый МАЛАШКА** расказаў, што ў апошнія гады ў Беларусі актыўна займаліся ліквідацыяй дэфіцыту кадраў у галіне радыялогіі. Было арганізавана навучанне адпаведным спецыяльнасцям у Гомельскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, перападрыхтоўвалі і ўрачоў іншых спецыяльнасцяў на ўзроўні паслядыпломнай адукацыі, у краіне ўкараняліся ангіяграфічныя цэнтры.

— Мы працягваем іх развіваць ужо не толькі ў сталічных клініках, а на ўзроўні міжраённых цэнтраў, гарадскіх устаноў аховы здароўя. Камп'ютарная тамаграфія стала звычайнай працэдурай. Мы пачалі выраблядь камп'ютарныя тамографы на нашых прадпрыемствах, і гэта пэўны тэхналагічны прарыў. Ён павялічвае магчымасці доступу насельніцтва да гэтага дыягнастычнага даследавання, — паведаміў Валерый Малашка.

Міністр падкрэсліў, што высокія тэхналогіі сёння знаходзяць сваё шырокае прымяненне на ўзроўні рэгіянальных і гарадскіх цэнтраў:

— Мы сціраем межы паміж раёнамі і абласцямі. Пацыент мае права звяртацца ў найбліжэйшую ўстанову аховы здароўя, дзе ёсць тая ці іншая высокая тэхналогія, і тут не трэба кіравацца прынцыпам геаграфіі трохузроўневага ці чатырохузроўневага аказання медыцынскай дапамогі. Пры інфаркце міякарда важны прынцып «залатога часу». Умоўна кажучы, фельчар хуткай дапамогі, устанавіўшы інфаркт міякарда і ведаючы, што ў суседнім раёне іншай вобласці ёсць ангіяграфічны комплекс, напрамую звязваецца з урачамі, і, мінуючы цэнтральную раённую бальніцу і нават прыёмны пакой міжраённага цэнтра, дастаўляе такога пацыента адразу ў ангіяграфічны кабінет, дзе яму павінна быць аказана сучасная медыцынская дапамога.

Валерый Малашка канстатаваў, што без развіцця службы прамянёвай дыягностыкі былі б немагчымыя тыя поспехі, якіх дасягнула наша медыцына — у прыватнасці, нізкія паказчыкі мацярынскай і дзіцячай смяротнасці, поспехі ў сардэчна-сасудзістай хірургіі, анкалогіі, транспланталогіі, траўматалогіі і артапедыі, гематалогіі.

**Алена КРАВЕЦ.**

# СМЕТНІК У ГОРАДЗЕ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гісторыя са сметнікам нагадвае дакучную казку пра белага бычка. Гардзееў за чысціню тэрыторыі змагаецца з пераменным поспехам вось ужо тры гады, калі заўважыў, што ліцэй пасля капрамонту пачаў хаваць будаўнічыя адходы непадалёк ад сваіх будынкаў. Тэлефанаваў, хадзіў на прыёмы, звярнуўся ў газеты. Парадак навялі, але потым усё паўтарылася. Летась Віталь Гардзееў звярнуўся на прамую лінію ў Магілёўскі аблвыканкам. Факт пацвердзіўся, мяркуючы па адказах з розных інстанцый, меры былі прынятыя. А зараз, атрымліваецца, усё зноў вярнуцца на кругі свае.

— На гэтым полі закапалі ўжо дзесяць тон смецця, не меней, там і поліэтылен, і бітая цэгла, і нават зламаныя аконныя рамы, — паказвае актывіст на парэзаную пратэктарамі трактара зямлю і на тыя галінкі і рваную плёнку, якія тырчаць з-пад яе.

— У ліцэі кажуць, што тэрыторыю ім хутка аддадуць пад палігон, — заўважае Віталь Гардзееў. — Але гэта не апраўданне безгаспадарчасці. Мне здаецца, што калі ўстанове дазволяць зрабіць тут палігон, яны яшчэ больш актыўна пачнуць хаваць тут сваё смецце. Мне спрабуюць даказаць, што гэта кампоставая яма, але ж які гэта кампост? Вы ж самі бачыце, што гэта жывое смецце. Ім тут ужо атруцілі ўсё навокал.

Суразмоўнік расказвае, што нават правёў невялічкае даследаванне наконт таго, каб даведацца, як доўга працягваецца гэта шкодніцтва. Кажа, што адзін з супрацоўнікаў ліцэя нават падзівіўся яго некампетэнтнасці. Маўляў, мы тут 30 гадоў смецце закопвалі, а ты толькі прачнуўся.

З другога боку ад «палігона» жылы двухпавярховік, абласная ветлабараторыя, нядаўна прапісалася шынамантажная станцыя. Вядома, што чыйсьці прыклад безгаспадарчасці парадже яшчэ большую безгаспадарчасць. Ніхога не хочацца абвінавачваць, але ж тутэйшая тэрыторыя сапраўды непрыглядная. Шмат хмызняку, кучы апалай лістоты, а каля агароджы шынамантажу яшчэ і будаўнічае смецце. Магчыма, прадпрыемства яшчэ не паспела прыбрацца, але старшыня вулічкома заўважае, што смецце не ўчора з'явілася.

Каля жылога дома знаёмімся з жыхарамі — Галінай і Аляксандрам. Яны жывуць тут тры гады. Аляксандр звяртае ўвагу на тое, што вельмі часта бачылі, як па полі каля ліцэя раз'язджае трактар і ўсё нешта трамбуе. Што менавіта, не ведае. Прызнаецца, што яму гэта зусім нецікава.

Супрацоўнікі ветлабараторыі на наш нечаканы візіт рэагуюць насцярожана. «Сваю лістоту мы складзіруем пакуль на сваёй тэрыторыі ў мяхах. Калі жадаеце, можаце паглядзець», — запрашае кіраўнік.



На ліцэй тут нагаворваць не хочуць. Маўляў, нам да іх ніякай справы няма, у нас сваіх хапае.

— Таму і безгаспадарчасць навокал, што нікому справы няма, — абураецца Васіль Гардзееў. — Ад агароджы тры метры адмералі, і ўсё — астатняе не маё, чужая тэрыторыя.

У папцы Гардзеева шмат афіцыйных адказаў на яго звароты, але ж галоўнае не ў тым, каб адказаць, трэба праблему вырашыць раз і назаўсёды. Пасля таго як абзваніла некалькі камунальных службаў, у тым ліку Магілёўскую гарадскую інспекцыю прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, яшчэ больш стала паважаць Віталя Гардзеева за яго прынцыповую пазіцыю. Бо сутыкнулася з тым, што нават банальнае пытанне з утылізацыяй той жа асенняй лістоты выклікала ў многіх цяжкасці. Адказныя асобы з поўнай сур'ёзнасцю разважалі пра тое, што гэта асабістая справа кожнага, ніхто не забараняе хоць ліцэю, хоць прамысловаму прадпрыемству з яго аграмаднай плошчай рабіць кампоставыя ямы на сваёй тэрыторыі. І толькі ў «Магілёўзеленбудзе» мне выразна паведамілі, што лістота — гэта не што іншае як від адходаў, які афіцыйна зарэгістраваны ў адпаведным класіфікатары Рэспублікі Беларусь.

— А калі гэта адходы, то іх трэба вывозіць, — падкрэсліў **начальнік аддзела прававой і кадравай работы «Магілёўзеленбуда» Сяргей ТУРЧЫКАЎ.** — Для гэтага ў нас ёсць спецыяльны палігон, які знаходзіцца на тэрыторыі прамзоны каля «Магілёўхімвалакна». На жаль, дагавораў у нас толькі некалькі дзясяткаў. Магчыма таму, што паслуга платная, за ўтылізацыю кубаметра апалай лістоты трэба заплаціць крыху больш за сем рублёў.

Дарэчы, сёння «Магілёўзеленбуд» штодзённа вывозіць на свой палігон прыкладна 40—50 кубоў лістоты ў дзень. А куды дзяваецца тое, што збіраецца на замацаваных за рознымі арганізацыямі, установамі і прадпрыемствамі?

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**




## ДАЙ БОЖА, КАБ БЫЛО ГОЖА

У 1960—1970-я гады мінулага стагоддзя доследны рыбгас «Белае» (і, адпаведна, яго дырэктара Васіля Радзівонавіча Рыбалку) ведала ўся Беларусь. Як-ніяк тут вырошчвалася да 2000 тон таварнай рыбы і пастаўлялася яна ва ўсе куткі рэспублікі. Больш за тое, нашы палескія карпы ды шчупакі прадаваліся ў Маскве і Ленінградзе, попыт, казалі, быў велізарны.

Дык вось, падышоў я неяк да адной з сажалак, прычым у добры час: рыбакі збіраліся палуднаваць і для гэтага наварылі юшкі. Наварылі, трэба разумець, з запасам, бо з ахвотай прапанавалі мне. Я толькі прылажыўся да яе, пакаштаваў, — пад'язджае Васіль Радзівонавіч, пытае:

— Ну, як вам юшка?

— Ды смачнейшай, — кажу, — мусіць, не бывае!.. А тым больш калі ў хаце немцы.

— Гэта якія? — насцярожыўся дырэктар. — І прычым тут яны?

— Ды пры тым, — уздыхаю, — што з жонкай крыху пасварыліся. Як нямая стала: не гаворыць са мной, не гатуе нічога.

Паспачуваў мне Васіль Радзівонавіч, разам з намі паабедаў, пагарыў. А праз дзень-другі я да яго ў кабінет зайшоў (нейкая справа была). Толькі павітаўся, дырэктар кажа:

— Успамінаў вас сёння...

— Пра воўка памоўка, а воўк і тут?

— ...Уяўляеце, прачнуўся раніцай, а з кухні нічым не пахне. І жонка маўчыць. Пытаюся: «Можа, і ў нас ужо немцы пасяліліся?» — «З чаго ты ўзяў? — не разумее мая, — нешта прыснілася?»... Прыйшлося расказаць ёй пра вашых «кватарантаў». Разам пасмяяліся ды паспадзяваліся, што столькі гадоў без немцаў пражылі, дык, можа, і далей неяк пратрымаемся?

...Дай божа, каб было гожа, — ва ўсіх.

**Васіль Пяшэвіч,**
*в. Юркевічы, Жыткавіцкі раён.*

## ХТО НА ШТО ВУЧЫЎСЯ

З раніцы ў суботу ў Колі забалеў зуб — прычым зноў.

Яго на добры толк даўно трэба было вырваць. Але ж адзін напамін пра кабінет стаматолага выклікаў у яго панічны страх. Вось і цяпер на жончыны ўгаворы паехаць у райцэнтр Коля не паддаваўся, вырашыў пацярпець, паспадзявацца: а раптам возьме і перастане балець?

Не з ягоным шчасцем, як той казаў. Бліжэй да абеду боль пачаў узмацняцца, а надвячоркам і ўвогуле стаў нясцерпны. Калола ды свідравала, здаецца, усюды — у віску, у воку, у вуху. Ды што там — нямела нават шыя. І пры гэтым ні таблеткі, ні народныя сродкі ўжо не спрацоўвалі: Коля мусіў згадзіцца на візіт да стаматолага. Аднак дзе ты знойдзеш яго ў суботу ды яшчэ і вечарам? Хіба што дома?

З цяжкасцю, праз знаёмых сваіх знаёмых, адшукалі хатні нумар тэлефона, потым доўга ўгаворвалі, і доктар згадзіўся прыняць пацыента.

...У райцэнтр ён паехаў з «групай падтрымкі»: з жонкай Ленай і аднавяскоўцам Сашам.

З ім якраз і пайшоў у дом стаматолага. Лена засталася чакаць у машыне, хвалявацца, глядзець на дзверы, каб хвілін праз пятнаццаць ці дваццаць у святле высокага вулічнага ліхтара ўбачыць... шчаслівую фізіяномію свайго мужа і збялелую, няшчасную... Сашы.

Высветлілася, што ў доктара не аказалася так званай замарозкі — па яе трэ было з'ездзіць у аптэку. Аднак Коля, што называецца, махнуў рукой, сказаў: «Рвіце так! Мацней балець ужо не будзе»...

Вось доктар і згадзіўся. Пасадзіў пацыента на табурэт пасярод кухні, сам уважліва агледзеў зубы (Саша ў гэты час трымаў над імі настольную лямпу), узброіўся патрэбным інструментам і, як той казаў, працэс пайшоў.

Доктар быў дужы, спрактыкаваны, таму зуб «падчапіў» удала і вырваў яго ўвесь — з першага заходу. Коля толькі яўкнуў паспеў, а вось «асістэнт»... «аб'ехаў» на падлогу — страціў прытомнасць...

— Нічога не скажаш — падтрымаў ты мяне, — рагатаў потым Коля.

— І не кажы, — «дазваляў» яму сябрук, камечачы ў руках ватку з нашатырным спіртам, — бо ты не бачыў таго, што я. А каб прыйшлося, можа, грымнуўся б сам... І як гэтыя дактары працуюць?

...Як быццам проста: хто на што вучыўся.

**А. Несцяронак,**
*г. п. Докшыцы.*

## ПАСЛЯ БУРЫ, або Перапалох раённага маштабу

Гэту гісторыю я неаднойчы пераказвала сваім сябрам і знаёмым. Рэакцыя была прадказальная: смяяліся многія, але ў праўдзівасць не верыў амаль ніхто, магчыма, таму, што занадта камічнымі выглядалі і сама сітуацыя, і «змагары з наступствамі». Аднак што было, тое было: чысцюткая праўда, хоць ні месца дзеяння, ні імёнаў ды прозвішчаў я называць не буду. Чаму — зразумееце пазней. Такім чынам...

Пачатак 2000-х. Жнівень. Камандзіроўка ў раённы цэнтр. Нас з калегам (як-ніяк са сталіцы!) на аўтавакзале сустракаюць прадстаўнікі мясцовай улады: супрацоўніца аддзела ідэалогіі (назавём яе Галінай Ленідаўнай) і памочнік старшыні райсавета дэпутатаў (няхай ён будзе Алегам Мікалаевічам).

З імі на службовай машыне мы едзем у цэнтр горада. Па дарозе, як водзіцца, размаўляем, разглядаем мясцовыя славутасці і нарэшце пад'язджаем да выканкама. На плошчы перад ім легкавушка робіць «ганаровы круг». Але і без яго мы, відома ж, заўважылі б і досыць доўгі рад неверагодна прыгожых елак, што раслі ўздоўж будынка, і досыць нечаканыя пастаці, што ўзвышаліся ля ўваходу: Маркс і Ленін як быццам, аднак пафарбаваныя, як сказаў бы небязвядомы Кіса Вараб'янінаў, у... радыкальны чорны колер...

У нас з калегам адразу ж з'явіліся пытанні: ну, сапраўды, калі ёсць Маркс, то дзе падзеўся Энгельс (нам жа «дуэтам» іх заўжды прадстаўлялі)? Гэта — па-першае. Па-другое, чаму яны з ног да галавы чорныя, з-за чаго нагадваюць не праваднікоў рэвалюцыі, а прадстаўнікоў якога-небудзь паўднёваафрыканскага племені?

Галіна Леанідаўна замест адказу ўсміхнулася ды кінула вокам на Алега Мікалаевіча, нібыта раілася з ім, як быць?.. А потым, што называецца, махнула рукой — маўляў, усё роўна шыла ў мяшку не схаваеш: не пачуем праўды ад яе, — даведаемся ад іншых...

Вось і расказала, што ў свой час, калі ўзводзілі гэты будынак, тры статуі проста не «ўпісаліся» ў архітэктурнае рашэнне — месца хапала толькі для двух. Вырашылі, што «лішнім» будзе Энгельс: ён не настолькі вядомы, як Маркс, і тым больш не такі ўжо славуты, як Ленін...

Ну а гісторыя з афарбоўкай і ўвогуле неверагодная.

Першапачаткова, расказвала наша спадарожніца, і Ленін, і Маркс былі пафарбаваныя ў цалкам прыстойны серабрысты колер. Але аднойчы, за пару дзён да Дня Незалежнасці, адбылося страшнае: над райцэнтрам пранеслася бура і, як гэта заўсёды бывае, наламала дроў — прычым літаральна... Пад напорам стыхіі не ўстаяла і адна з тых елак-прыгажунь, прычым яна не проста ўпала, а рухнула... на плечы правадыру.

Постаць яго гэты ўдар вытрымала, а вось галава... Яна, як сказалі б у часы Людовіка XIV, аказалася адасобленай ад цела... Таму людзі, падабраўшы яе, занеслі напрамкі ў кабінет старшыні райвыканкама.

З гэтай нагоды тут жа быў скліканы «кансіліум», і ўжо яго ўдзельнікі сталі ламаць галовы над праблемай: што ж рабіць далей? За два дні (хутка ж свята, ды яшчэ якое!) стварыць новую статую, як той казаў, не ўяўлялася магчымым. Ды і сродкаў на гэта не было.

Вырашылі тэрмінова шукаць спецыяліста-зваршчыка, які прыладзіў бы галаву да тулава. І такі, вядома ж, знайшоўся: справу ведаў, як «Ойча наш», зрабіў усё якасна, хутка і, што важна, ледзьве не ноччу (каб не прыцягваць увагу людзей). Так што раніцай... горад ахнуў! На падыходзе да райвыканкама ўсіх і кожнага сустракаў серабрысты Ільіч з... чорнай стужкай ад зварачнага шва на шыі, што выклікала недвухсэнсоўныя асацыяцыі.

Новы «кансіліум», які яшчэ раз спехам сабраўся ў галоўнага, пастанавіў: фігуру правадыра тэрмінова закрыць кавалкам тканіны, а ноччу абедзве фігуры (ну, каб ніхто не пытаўся, чаму гэта Ленін — чорны, а Маркс — серабрысты) перафарбаваць... У колер «стужкі».

Такім чынам, свята правадыры сустракалі ўжо ў новым «убранні».

...Тады, у машыне, пачуўшы гэтую гісторыю, мы з калегам доўга смяяліся і разам з тым крыху спачувалі — як жывым героям перапалоху, так і правадырам рэвалюцыі, што ў дзень свята паўсталі перад людзьмі ў такім нечаканым выглядзе.

А зрэшты, можа, яны і сёння так стаяць? Хто ведае.

**Наталля К.,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

**Ад яе ж** чарговы напамін, што ўсе «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі з жыцця чытачоў» на старонках «Звязды» не проста друкуюцца, — яны ўдзельнічаюць у конкурсе на найлепшую. Вынікі яго будуць падведзены на пачатку наступнага года. Журы — і вялікае чытацкае, і маленькае рэдакцыйнае — праце, гісторыі пошта прыносіць... Дасылаючы іх, калі ласка, паведамляйце свае пашпартныя даныя і — на ўсякі выпадак — нумар тэлефона для аператыўнай зваротнай сувязі.

Неасабісты суб'ектыў



# Смачна? Па-беларуску??

### Калі стравамі нацыянальнай кухні называюць салянку і бужаніну — гэта нармальна?

КАЛЕГА пасля работы сабраўся схадзіць на Тыдзень беларускай кухні, які праходзіць зараз у Мінску. Мы, спяшаючыся дадому, толькі зайздросліва паўздыхалі ды наказалі яму як след усё прадэгуставаць і пасля расказаць, ці яно таго варта. Ужо назаўтра з раніцы, яшчэ не даехаўшы на работу, я ведала пра ўражанні нашага дэгустатара. Лепш за ўсе словы гаварыла яго фота, выкладзенае на старонцы ў сацыяльных сетках, дзе ён з тварам, выраз якога інакш як «пад прымусам» назваць нельга было, сядзеў над талеркамі. Ды яшчэ невясёлы смайлік, статус «сумуючы па доме» і каментарый: «Тыдзень беларускай кухні. Ну так сабе...»

Што яно «ну так сабе», было зразумела нават па фота. Першая страва, візуальна падобная на салянку або харчо (і тое, і тое мае да беларускай кухні адносіны вельмі ўмоўныя) была густа пасыпаная крышанай пятрушкай. Побач стаяла талерка з кавалкам мяса, на ёй жа ў крыху меншай пасудзіне, чым загадкавы суп, была нейкая бляклая-ружовая субстанцыя, падобная на халаднік. Збоку прытуліўся зморшчаны печаны яблык на спадачку... «Там яшчэ была нейкая горкая незразумелая салата ды ўдубелыя бліны», — расказаў калега ўжо прад планёркай. А субстанцыя ў місцы аказалася соусам з хрэнам — мяркуючы па аб'ёме, яго можна было наесціся на ўсё астатняе жыццё.

І хоць ахвота каштаваць сёлетнюю «нацыянальную кухню» адбілася зусім, я ўсё ж пацікавілася, што павінна сёлета ўваходзіць у меню названага Тыдня — як вядома, яно ва ўсіх установах грамадскага харчавання, якія далучаюцца да мерапрыемства, адзінае, стравы гатуюцца па аднолькавых рэцэптах і прадаюцца па адной цане. Дык вось, гэтым разам мы маем наступны спіс пяці страў: салата з курыцы з агароднінай і мядова-гарчычнай запраўкай, салянка (ага, усё-такі гэта была салянка!) шляхецкая, бужаніна з печанай агароднінай і смятанным соусам (з хрэнам!), бульбяныя калдуны з мясам і смятанай (людзі, а хто-небудзь чуў пра калдуны не з бульбы і без мяса?!) і дэсерт — печаны яблык з тварожнымі блінцамі.

ВЫ, канешне, мне прабачце, але што з гэтага меню — стравы НАЦЫЯНАЛЬНАЙ кухні? Салянка, якая паўсюль, ва ўсіх крыніцах, ва ўсіх кулінарных кнігах падаецца як адна з асноўных страў рускай кухні? Ці бужаніна — яна ёсць і ў рускіх (усходнія суседзі гатавалі яе нават з мядзведжага мяса), і ва ўкраінцаў. Нічога не маю супраць гэтай вельмі нават смачнай ежы, разумею, што кулінарныя традыцыі ў суседніх народаў, як і мова, і фальклор нярэдка пераплятаюцца, паўтараюцца. Але ёсць жа ў кожнага народа і сваё, адметнае, і ў нацыянальнай кухні таксама. І ў нас — не горш, чым у астатніх. І не толькі дранікі, калдуны ды верашчака, якія, мякка кажучы, усім ужо прыеліся. Чаму б на першую страву не падаць вараную кіслую капусту-шаткаванку з сушанымі грыбамі або са свіной гудзікай? Ці фасолю з панцаком і моркай, запраўленую малаком? А на другое — чаму б не зрабіць сапраўдную бабку — сакавітую, з празрыстымі духмянымі скваркамі? Спячыце ў печы звычайны бабулін праснак — і ён будзе выглядаць болей па-беларуску, чым універсальныя для ўсіх славян бліны. А яшчэ ж ёсць тварожнікі, кулага, маннік... У мяне асабіста, ад адных толькі назваў слінкі цякуць, бо ўсё гэта елася напоўніцу ў дзяцінстве, і гатавала іх бабуля 1905 года нараджэння — захавальніца мясцовай мовы, звычаяў, рэцэптаў. І гатавалася ўсё ў печы, хоць была ў хаце газавая пліта. І была ў тым своя адмысловая навука: каб угадаць, каб не была занадта гарачая ці халодная, а стравы з печы крыху пахлі бярозавымі дровамі, і ў крупніка заўсёды была наверсе духмяная запечаная скарыначка — самае смачнае, што даводзілася каштаваць у жыцці. Не ведаю, як для каго, а для мяне вось гэта стравы беларускай кухні, а не салянка, разагрэтая — мо ўжо і не першы раз — у мікрахвалёўцы (калегу-дэгустатара абурыў яшчэ і гэты факт).

**1908** год — нарадзіўся Барыс Аляксандравіч Смірноў, расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст СССР. Працаваў у ленінградскіх тэатрах, у маскоўскім тэатры Пушкіна, у МХАТе. Выканаўца роляў У. І. Леніна ў тэатры і кіно. Здымаўся ў фільмах «Камуніст», «Асабіста вядомы», «Балтыйская слава», «Апасіяната» і іншых. Памёр у 1982 годзе.





***Беларусікаў стала больш!***
***На Сымонку...***
**Шаноўную каляжанку *Надзею Дрындрожык, яе мужа, бацькоў — усю радзіму,* шчыра віншуем з доўгачаканым папаўненнем!**
**Добрага здароўя вам! Бадзёрасці! Поспехаў, грошай... Яшчэ і на беларусачак.**
**Звяздоўцы.**

## УСМІХНЕМСЯ

**Жанчыны вельмі хітрыя: каб не губляць шкарпэткі, яны прывязалі іх да трусоў і назвалі гэтую канструкцыю «калготкі».**

**Мерапрыемства «навесці парадак у гаражы» складаецца з двух пунктаў:**
**1. Расставіць хлам уздоўж сцен.**
**2. Выпіць.**

Бос пытаецца сакратарку:
— А вы ведаеце японскую мову?
— Так, вядома, я ж пісала пра гэта ў сваім рэзюмэ.
— Дзе?!
— У наступным радку пасля аб'ёму грудзей.
— А-а! А я далей не чытаў...





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3789.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 25 кастрычніка 2018 года.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

26 кастрычніка 2018 г. № 43 (476)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ

## ВЯЛІКІ ПАТЭНЦЫЯЛ МАЛЫХ ГАРАДОЎ

### Калі правінцыя стане перспектыўнай?



Фота БелТА.

**ТАА «БелМінералГруп» у г. Высокае Камянецкага раёна выпускае тэрмаізаляцыйныя матэрыялы з базальтавых парод, якія шырока прымяняюцца ў энергетыцы, будаўніцтве, вытворчасці бытавой тэхнікі. Прадпрыемства працуе з 2015 года, да гэтага прадукцыя з базальту імпартавалася з Расіі і Украіны. На здымку: аператар установкі базальт-супертонкага валакна Аляксандр ПАТОНІЧ кантралюе плаўленне базальту ў базальтавую нітку.**


ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 4-й, 13-й стар.


ФЕСТЫВАЛІМ!

## «З ЧАГО ПАЧЫНАЕЦЦА РАДЗІМА?»

**У Віцебску ўпершыню прайшоў фестываль моладзі прыгранічча «З чаго пачынаецца Радзіма?». Адным з заснавальнікаў і арганізатараў выступіў абласны Савет дэпутатаў.**

Цікава, што ў маштабнай акцыі бралі ўдзел студэнты, маладыя педагогі, навукоўцы не толькі з Віцебшчыны і суседніх расійскіх рэгіёнаў, але і здалёку. Напрыклад, з Томска, Омска, Валгаграда і нават Улан-Удэ...



**Выстаўка, што праходзіла ў рамках форуму моладзі, зацікавіла нават замежных студэнтаў.**

Як падкрэсліў **старшыня аблсавета Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ,** мясцовая ўлада з радасцю падтрымала ідэю правесці мерапрыемства. На яго погляд, фэст можа стаць пачаткам для рэалізацыі іншых сумесных праектаў.

Напрыклад, у свой час у Віцебску праводзіўся фестываль «Студэнцкая вясна», які вельмі падабаўся як удзельнікам, так і гараджанам. І яго можна ў найбліжэйшай перспектыве адрадзіць у новым фармаце. Тым больш што падтрымку ў рэалізацыі сумесных праектаў абяцалі ў маладзёжных арганізацыях дзвюх краін: Расійскім саюзе моладзі, БРСМ і прадстаўніцтве Рассупрацоўніцтва ў Беларусі.

У рамках фэсту адбыліся розныя акцыі. Напрыклад, хлопцы і дзяўчаты высадзілі дрэвы ў парку каля канцэртнай залы «Віцебск». Правялі круглыя сталы з удзелам маладых журналістаў, конкурс медыяпраектаў. Працавалі «дыскусійныя пляцоўкі». Адбыліся і сустрэчы будучых дыпламатаў і парламентарыяў, расійска-беларускі злёт маладых настаўнікаў.

Многіх зацікавілі выстаўкі творчасці студэнцкай моладзі, археалагічнай і іншых калекцый, якія належаць Віцебскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя П. М. Машэрава.

У якасці ганаровых гасцей на міждзяржаўную маладзёжную акцыю былі запрошаны парламентарыі Беларусі і Расіі, прадстаўнікі органаў дзяржаўнай улады розных узроўняў, дэпутаты мясцовых Саветаў.

Падчас урачыстай цырымоніі закрыцця фестывалю найбольш актыўных удзельнікаў узнагародзілі дыпломамі, прызамі і памятнымі падарункамі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Адмова на мяжы



Чаму расце колькасць беларусаў, якія не могуць трапіць у Ізраіль? стар. 2

### Папкорн і харчовыя пілеты



Ганцавіцкія хлебапёкі накіруюць амаль два мільёны долараў на інавацыйную вытворчасць. стар. 4

### Як «падцягнуць» слабыя рэгіёны?



Эканамісты ствараюць новую мадэль развіцця сярэдніх гарадоў. стар. 14

### Парк замест трухлявага дома



Маладыя хвойкі высадзілі ў Гарадоцкім раёне на месцы старой пабудовы. стар. 16

### Аўтакрама не прыедзе



Чаму ў Хойніках райспажыўтаварыства аптымізавала маршруты? стар. 16

КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 9



## ПАРТНЕРСТВО КАК ГЛАВНАЯ ЦЕЛЬ

*В январе будущего года Беларусь проведет первый национальный форум по Целям устойчивого развития*

**На мероприятии также рассмотрят Национальную стратегию устойчивого развития до 2035 года.**

На текущей неделе Марианна Щеткина как национальный координатор по достижению Целей устойчивого развития (ЦУР) приняла участие во встрече рабочей группы Национального собрания Республики Беларусь по достижению ЦУР с главами агентств ООН.

Сенаторы и представители ООН презентовали свою деятельность по поддержке реализации ЦУР. Приоритетными по тематике были четыре направления — будущие поколения, цифровая трансформация и социальные инновации, гендерное равенство, «зеленый» переход к инклюзивному и устойчивому росту.

Главное условие для достижения Целей устойчивого развития, по мнению Марианны Щеткиной, — партнерство всех заинтересованных: Совета по устойчивому развитию, парламентской и партнерской групп, страновой команды ООН.

«Важно, когда все мы настроены на результат. Именно сплоченность способствует прогрессу по достижению ЦУР. От этого зависит будущее не только нашей страны, но и планеты», — передает слова Марианны Щеткиной пресс-служба Совета Республики.

## VIVA ИТАЛИЯ!

*Товарооборот Беларуси и Италии показывает положительную динамику*

**«По итогам 2017 года сумма взаимной торговли прибавила 20 %, и это далеко не предел», — отметила заместитель председателя Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь Марианна Щеткина на встрече с Чрезвычайным и Полномочным Послом Итальянской Республики Марио Джорджо Стефано Бальди.**



sovrep.gov.by

**Марианна ЩЕТКИНА и Марио Джорджо Стефано БАЛЬДИ.**

Кроме торгово-экономического, на повестке — вопросы межпарламентского взаимодействия. В частности, обсуждалась перспектива создания группы дружбы из числа депутатов.

Особый блок — гуманитарное сотрудничество. Здесь речь шла о реализации совместных проектов, взаимодействии союзов женщин и туристическом потенциале Беларуси. Посол отметил, что интересу к нашей стране способствует безвизовый режим.

Дипломат пообещал и в дальнейшем поддерживать проект, в рамках которого белорусские дети посещают Италию. В ответ Марианна Щеткина предложила организовать итальянским ребятам отдых в белорусских оздоровительных лагерях.

## ВОДНЫЙ БАЛАНС

*Проблемные вопросы обеспечения населения качественной питьевой водой обсудили в Совете Республики*

**Председатель Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Александр Попков провел на прошлой неделе совещание с участием председателя Постоянной комиссии Палаты представителей по жилищной политике и строительству Юрия Дорогокупца, министра ЖКХ Александра Терехова, замминистра природных ресурсов и охраны окружающей среды Андрея Хмеля и других.**

Как сообщается на интернет-ресурсе Совета Республики, во время совещания обсуждались проблемные вопросы в сфере обеспечения населения качественной питьевой водой, требующие законодательного регулирования в рамках подготовки проекта Закона Республики Беларусь «О внесении изменений и дополнений в некоторые законы Республики Беларусь по вопросам питьевого водоснабжения». Отмечена необходимость дополнительной проработки положений законопроекта, регулирующих ключевые для отрасли аспекты, касающиеся приоритетного использования технической воды для промышленных и других производств, контроля за рациональным водопользованием, а также создания и деятельности единого научно-практического центра водного хозяйства.

## НАУЧНАЯ СТРАТЕГИЯ

**Площадкой для координации работы стала XIX Международная научная конференция «Проблемы прогнозирования и государственного регулирования социально-экономического развития».**

Участие в мероприятии принял председатель Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь по экономике, бюджету и финансам Владимир Пантюхов.

Организатором ежегодного форума выступил Научно-исследовательский экономический институт Министерства экономики Республики Беларусь.

Формат встречи был рассчитан на три дня. В первый день с участием польских коллег рассматривались приоритеты развития регионов в контексте трансграничного сотрудничества с ЕС, во второй день прошло пленарное заседание. По итогам форума участники круглого стола обсудили цели и содержание Национальной стратегии устойчивого развития — 2035.

**Мария ДАДАЛКО.**

# НА ПУТИ РАЗВИТИЯ

**Ряд изменений рассмотрели сенаторы на заседании пятой сессии Совета Республики Национального собрания**

**Заседание прошло под председательством спикера верхней палаты парламента Михаила Мясниковича. Было рассмотрено восемь вопросов. В частности, одобрены проекты законов «О внесении дополнения в Гражданский процессуальный кодекс Республики Беларусь», «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «О транспортно-экспедиционной деятельности», «О внесении изменений и дополнений в Закон Республики Беларусь «Об электронном документе и электронной цифровой подписи» и другие.**



Фота БелТА.

Одним из первых вопросов, вынесенных для обсуждения, стала ратификация статей соглашения Азиатского банка инфраструктурных инвестиций. Чем интересен для нас этот банк, пояснил **Сергей РАХМАНОВ, председатель Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания Беларуси по международным делам и национальной безопасности.** «Это не рядовое событие — подключение Беларуси к Азиатскому банку инфраструктурных инвестиций, — считает председатель комиссии. — Существующая ныне международная финансовая система устраивает далеко не всех, потому что сейчас доминируют западные страны, несмотря на государства, которые добились серьезных успехов в последнее время и имеют высокий экономический рейтинг. У Китая, например, сейчас вторая экономика в мире, а его доля в международных финансовых структурах меньше тех, чьи экономики отстают от китайской. Инициатива создания Азиатского банка инфраструктурных инвестиций ориентирована, с одной стороны, на поддержку инвестиций в рамках проекта «Один пояс — один путь» и в целом на развитие инфраструктуры в азиатском регионе и за его пределами. А с другой стороны, этот проект является глобальным, поэтому присоединение к нему Беларуси имеет важное значение как для нашей национальной экономики, так и для активизации участия нашей страны в глобальных проектах».

Как отмечает Сергей Рахманов, в этом банке будут доминировать не западные государства — хотя туда подключились практически все развитые страны мира, кроме США и Японии, — а Китай, Индия, Россия. Это дает хорошие возможности нашему государству для реализации проектов, если учитывать серьезные стратегические отношения Беларуси с ними. Условия предоставления средств в рамках деятельности банка соответствуют лучшим мировым стандартам. «Здесь, я думаю, Беларусь будет в высшей степени удовлетворена этим процессом», — резюмировал сенатор.

**Виктор СИРЕНКО, председатель Постоянной комиссии Совета Республики Национального собрания Беларуси по образованию, науке, культуре и социальному развитию,** прокомментировал изменения, касающиеся закона «Об электронном документе и электронной цифровой подписи». Такой тип подписи уже активно используется. Электронный документооборот также уже внедрен во многие сферы, поэтому основное изменение, которое предлагалось рассмотреть на заседании, касалось совершенствования использования цифровой подписи. Например, чтобы прояснить, что такая подпись привязана к должности и фамилии, поэтому при смене места работы электронная подпись «уходит» вслед за ее владельцем. В целом же эта сфера развивается, чтобы избежать дублирования на бумажном носителе.

**Надежда АНИСОВИЧ.**

ВСТРЕЧИ

# ПОТЕНЦИАЛ ДЛЯ СОТРУДНИЧЕСТВА

**Степень парламентского участия в дальнейшем развитии белорусско-израильского сотрудничества обсуждалась на встрече председателя Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Александра Попкова с депутатом кнессета Государства Израиль Йоэлем Развозовым.**

Во время встречи в Совете Республики парламентарии обеих стран пришли к единому мнению, что Беларусь и Израиль имеют большой потенциал для дальнейшего развития взаимовыгодного сотрудничества.

По мнению Александра Попкова, для многих израильтян с белорусскими корнями наша страна может стать привлекательной для вложения инвестиций и активизации торгово-экономических отношений. «150 миллионов долларов белорусско-израильского товарооборота — это крайне мало для наших стран», — подчеркнул парламентарий. В свою очередь белорусским аграриям интересен опыт израильских коллег как в сфере энергосбережения в системе АПК, так и в части переработки отходов сельскохозяйственного производства.

Двукратный вице-чемпион Европы по дзюдо, а ныне депутат израильского парламента Йоэль Развозов приехал в Беларусь не в первый раз. Он с удовлетворением отметил гостеприимство, доброжелательность белорусов, чистоту и порядок в городах и небольших населенных пунктах. Это, по его мнению, способствует увеличению потока туристов в нашу страну, которые уже проявляют большой интерес к II Европейским играм, что пройдут в Беларуси в 2019 году.

По словам израильского парламентария, Беларусь сегодня привлекательна для зарубежных туристов как страна, которая не вызывает опасения с точки зрения нелегальной миграции, — большинство белорусов приезжает в Израиль с туристическими целями. Тем не менее количество отказов во въезде с израильской стороны растет, с начала этого года уже 404, тогда как в 2017-м их было 249. С белорусами, по мнению депутата, необходимо проводить разъяснительную работу о необходимых документах и правилах прохождения израильской границы.

Большие перспективы у белорусско-израильского сотрудничества и в сфере развития оздоровительного туризма в нашу страну. Белорусская сторона готова рассматривать инвестиционные предложения по созданию совместного центра по оздоровлению на базе одной из белорусских областей.

Израиль может стать важнейшим инвестиционным партнером Беларуси в части активизации кооперации наших стран в области IT-технологий.

Расширение торгово-экономических связей, сотрудничество в аграрной отрасли, развитие оздоровительного и агроэкотуризма, возможность реализации программ по обмену специалистами и взаимодействие в области новейших технологий — это не полный перечень перспективных направлений сотрудничества двух стран.

Александр Попков призвал израильтян, имеющих белорусские корни, активно участвовать в реализации проектов по сохранению мест исторической памяти, которых немало на территории нашей страны, и сохранению культурных связей Беларуси и Государства Израиль.

Во встрече также приняла участие заместитель председателя Постоянной комиссии Совета Республики по образованию, науке, культуре и социальному развитию Екатерина Дулова. По итогам беседы в Совете Республики выражена обоюдная заинтересованность в дальнейшем расширении связей по линии парламентов двух стран.

**Наталья БИТЕЛЬ.**

# БИЗНЕСВУМЕН В ГЛУБИНКЕ

## Предпринимательская активность женщин — ресурс для развития сферы занятости

**О роли прекрасного пола в общественно-политической жизни страны, условиях труда и развитии потенциала сельских жительниц шла речь на выездном круглом столе Белорусского союза женщин.**

«Духовный потенциал сельской женщины как фактор укрепления и развития малой родины» — тема встречи, на которой присутствовала **председатель общественной организации, заместитель председателя Совета Республики Марианна ЩЕТКИНА.**

«БСЖ уделяет особое внимание работе с сельскими женщинами, вовлекая их в активную общественную деятельность, приобщая к решению социальных вопросов, направленных на улучшение уровня и качества жизни на селе, — подчеркнула Марианна Щеткина. — Необходимо уделять повышенное внимание малому бизнесу на селе, поддерживать его развитие, а местным властям создавать необходимые условия для развития женского предпринимательства».

Выездное заседание прошло в ОАО «Озерицкий-Агро», расположенном в Смолевичском районе, что на Минщине. Также участницы встречи посетили Прилепский учебно-педагогический комплекс детский сад — средняя школа и молочнотоварную ферму «Задомля».

**Мария ДАДАЛКО.**

ПАРАДАК ДНЯ

# Сенатары працуюць над фарміраваннем крыніц эканамічнага росту

**Пра гэта ў інтэрв'ю «Мясцоваму самакіраванню» расказаў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімір ПАНЦЮХОЎ. Размову аб рабоце Камісіі мы пачалі з падзей, якія адбыліся нядаўна.**



***— Уладзімір Іванавіч, як пяты Форум рэгіёнаў паўплываў на жыццё Магілёўшчыны?***

— Сам факт, што форум праходзіў у рэгіёне, — падзея. Мясцовыя жыхары і праз тыдзень хадзяць у прыўзнятым настроі і з задавальненнем згадваюць тыя дні. Я ўпэўнены, што пяты форум атрымаўся найлепшым: па атмасферы, змесце, колькасці і маштабах заключаных здзелак. Кіраўнікі кампаній імкнуліся падпісаць дакументы менавіта на форуме. Пакажальна, што падчас Савета дзелавога супрацоўніцтва на працягу паўгадзіны было падпісана кантрактаў на суму больш за чатырыста мільёнаў долараў. Праўда, гэтаму папярэднічала сур'ёзная і ўдумлівая работа напярэдадні.

Дарэчы, Савет дзелавога супрацоўніцтва прайшоў у рамках форуму ўпершыню. Ён працаваў у дзвюх секцыях: прадстаўнікі ўлады і прадстаўнікі бізнесу. Былі абмеркаваны перш за ўсё пытанні прамысловага супрацоўніцтва, у тым ліку праблемныя.

Хачу падкрэсліць яшчэ адзін важны момант. Спікер Савета Федэрацыі Валянціна Мацвіенка прапанавала наступны форум пачынаць з вынікаў папярэдняга. Сапраўды, варта паглядзець, што адбылося з заключанымі пагадненнямі, як рэалізаваны камерцыйныя кантракты. Раней такая інфармацыя не акумулявалася.

Ад форуму, які адбыўся ў Магілёве, засталося задавальненне. Дзейнічаючы разам, мы маем шанцы пабудаваць годную будучыню. У гэтым уся квінтэсенцыя.

***— Раскажыце пра сухі астатак пасля завяршэння работы секцыі «Лічбавая эканоміка: супрацоўніцтва рэгіёнаў, стан і перспектывы».***

— Секцыя стала лагічным працягам палітыкі двух прэзідэнтаў. Уладзімір Пуцін падчас прамой лініі ў 2017 годзе сказаў, што без лічбавай эканомікі няма будучыні. Аляксандр Лукашэнка на чацвёртым Форуме рэгіёнаў у Маскве заявіў, што фарміраванне лічбавай эканомікі — адзін з кірункаў стратэгічнага партнёрства Беларусі і Расіі, а кіраўніцтва Беларусі паставіла перад сабой амбіцыйную задачу пабудаваць IT-краіну. Менавіта з гэтай мэтай пазней быў прыняты Дэкрэт № 8. Мы ў Магілёве паспрабавалі знайсці ў сферы лічбавізацыі эканомік пункты судакранання дзвюх краін, зразумець, у чым ёсць рознагалоссе, як яго пераадолець, каб працаваць разам і дынамічна развівацца.

На секцыі прагучала 18 дакладаў — гэта быў пошук шляхоў збліжэння заканадаўства і падыходаў. Выступоўцы пагадзіліся, што кааперацыя беларускіх і расійскіх кампаній на падставе скразных лічбавых працэсаў і развіцця лічбавых актываў павінна стаць галоўным кірункам развіцця Саюзнай дзяржавы. Найбольш перспектыўныя для сумеснага пераводу на «лічбу» сектары эканомікі — прамысловасць, сельская гаспадарка і энергетыка. Для гэтага неабходна гарманізаваць нарматыўную прававую базу, стымуляваць адпаведныя праекты, развіваць трансгранічную прастору даверу ў рамках лічбавага парадку дня ЕАЭС, рыхтаваць кадры. Яшчэ адзін важны кірунак — інфармацыйная бяспека.

Думаю, работа будзе працягнутая. Такое даручэнне майму калегу з Савета Федэрацыі агучыла на пленарным пасяджэнні і Валянціна Мацвіенка, а мне — Міхаіл Мясніковіч.

***— Такім чынам, форум завяршыўся — праца працягваецца. У тым ліку і заканатворчая. Дарэчы, якія дакументы ў эканамічнай сферы будуць разгледжаны ў Савеце Рэспублікі на бягучай восеньскай сесіі?***

— Традыцыйна ў парадку дня восеньскай сесіі — пакет бюджэтных законапраектаў. Савет Рэспублікі ініцыяваў двухгадовы фармат бюджэтнага планавання з улікам пятага Усебеларускага народнага сходу, таго, што мы выходзім на фініш пяцігодкі і трэба ствараць зачын на больш аддаленую перспектыву.

Кумулятыўны прырост ВУП у бягучай пяцігодцы ацэньваецца ў 10 мільярдаў долараў. Для выканання мэтавай задачы кіраўніка дзяржавы па дасягненні ў 2025 годзе аб'ёму ВУП у 100 мільярдаў долараў за ўсю наступную пяцігодку неабходна будзе прырасці на 35 мільярдаў. Таму ўжо цяпер трэба фарміраваць крыніцы ўстойлівага росту эканомікі і распрацоўваць прыярытэты сацыяльна-эканамічнай палітыкі краіны на 2021—2025 гады.

Трэба паказаць, як будуць размеркаваны бюджэтныя рэсурсы ў 2020 годзе, вызначыць прыярытэты фінансавання ў разрэзе асобных праектаў, «пераналадзіць» існуючыя меры падтрымкі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, экспарцёраў высокатэхналагічнай прадукцыі і інавацыйна актыўных прадпрыемстваў. Гэта стане пэўным сігналам для рэальнага сектара і бізнесу: планаваць бягучую і інвестыцыйную дзейнасць на больш аддаленую перспектыву, а не толькі на чарговы фінансавы год.

Дарэчы, па законапраекце аб бюджэце фонду сацыяльнай абароны асаблівых навацый не плануецца. Адным са шляхоў напаўнення бюджэту фонду мы бачым рост колькасці занятых у эканоміцы, а таксама ўключэнне ў сістэму дзяржаўнага сацыяльнага страхавання самазанятых.

На гэтай сесіі плануецца разгледзець абноўленую рэдакцыю Падатковага кодэкса. У праект уключаны шэраг нашых ініцыятыў: пашырэнне магчымасці выкарыстання інвестыцыйнага выліку па падатку на прыбытак; зніжэнне стаўкі падатку на прыбытак і падаходнага падатку з фізічных асоб у адносінах дывідэндаў у выпадку рэінвеставання ў развіццё вытворчасці; вызваленне новапабудаваных аб'ектаў і зямельных участкаў, на якіх яны размешчаны, ад маёмасных падаткаў у першы год іх эксплуатацыі.

Гэтыя новаўвядзенні будуць стымуляваць інвестыцыйную актыўнасць бізнесу і арыентаваць яго на далейшае развіццё. Яшчэ адзін законапраект, які нам належыць разгледзець, таксама можна аднесці да сферы інвестыцыйнага заканадаўства. Размова пра карэкціроўку закона «Аб прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці і пераўтварэнні дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў у адкрытыя акцыянерныя таварыствы». Праект закона прадугледжвае гарантыі правоў уласнасці пры добрасумленным набыцці дзяржаўнай маёмасці і выкананні ўмоў прыватызацыі (прынцып незваротнасці прыватызацыі дзяржмаёмасці, які адпавядае сусветнай практыцы).

Наперадзе таксама работа над законапраектамі «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва», «Аб эканамічнай неплацежаздольнасці», «Аб гаспадарчых таварыствах», «Аб дзяржаўных арганізацыях...» і іншымі.

Законы моцныя намі, а мы — законамі. Удасканаленне закона — прыкмета нашага часу. Выпраўляй мінулае, кіруй сённяшнім, прадугледжвай будучае... І ўсё атрымаецца!

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

КРАСНОАРМЕЙСКАЯ, 9



# Производству органической продукции — зеленый свет

*Ее экспорт позволит Беларуси дополнительно получить около 1 миллиона долларов*

**Совет Республики одобрил проект Закона Республики Беларусь «О производстве и обращении органической продукции». Накануне принятия нового законодательства верхней палатой парламента его основные положения обсудила Постоянная комиссия Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению.**

Необходимость законодательного урегулирования производства продуктов питания под знаком «органический продукт» назрела в нашей стране давно. С ростом популярности такой продукции у потребителей прилавки белорусских магазинов заполнили различные упаковки с приставками «био», «эко», пометкой «зеленый продукт». А между тем, по данным Министерства сельского хозяйства и продовольствия, в республике в настоящий момент 1,5 тысячи аккредитованных земель для производства так называемой экологически чистой продукции. И всего лишь около 20 наиболее крупных производителей имеет сертификаты, полученные за рубежом, которые дают право на производство органической продукции, включая фермерские, личные подсобные хозяйства и другие организации.

По мнению специалистов, потенциальные возможности развития отечественного производства органической продукции значительно шире. Сегодня Беларусь может получать дополнительно около 1 миллиона долларов от экспорта таких продуктов питания.

Активно применяют технологии производства биопродуктов и некоторые крупные белорусские сельхозпроизводители. Например, агрокомбинат «Снов» с введением в действие биогазовой установки регулярно вносит на поля порядка 50—60 тысяч тонн биогумуса и тем самым снижает химическую нагрузку на почвенную биофлору.

По мнению **председателя Постоянной комиссии Совета Республики по региональной политике и местному самоуправлению Александра ПОПКОВА,** принятие Закона Республики Беларусь «О производстве и обращении органической продукции» своевременно и необходимо. Новое законодательство дает «зеленый свет» для производства так называемой органической продукции всем, кто желает этим заниматься, да и потребители будут уверены, что приобретают продукт, качество которого подтверждено сертификатом. Однако, по мнению парламентария, к этому вопросу необходимо подходить разумно и взвешенно. Не стоит вводить в заблуждение население насчет того, что продукты питания с приставкой «био» будут производиться массово чуть ли не во всех хозяйствах. Необходимо учитывать особенности производства такой продукции на территории Беларуси: низкий уровень плодородия почв, природно-климатические условия, которые не позволяют получать высокие урожаи без внесения удобрений. В то же время закон «О производстве и обращении органической продукции» будет содействовать занятости сельского населения и созданию фермерских хозяйств по производству экологически чистых продуктов питания.

Принятым законодательством определено понятие органического производства, а также требования к производству и сертификации органической продукции. Планируется, что с принятием закона «О производстве и обращении органической продукции» Беларусь сможет вступить в Международную федерацию экологического сельскохозяйственного движения (IFOAM), что позволит нашим производителям иметь выход на рынки стран Европейского союза.

**Наталья БИТЕЛЬ.**



# Развіваць бізнес на мясцовай сыравіне

**Ганцавічы — горад з насельніцтвам крыху менш за 14 тысяч чалавек — знаходзіцца ў глыбіні беларускага Палесся. Гараджане — гэта ў асноўным выхадцы з навакольных вёсак, дзе захаваліся багатыя народныя традыцыі. І галоўнымі праблемамі як райцэнтра, так і раёна ў цэлым становіцца недахоп рабочых месцаў, а таксама магчымасці атрымліваць годную зарплату. Таму нярэдка самыя маладыя і працаздольныя выязджаюць на заробкі ў суседнія краіны. Як ілюстрацыя сказанаму вышэй — звесткі з сайта Нацыянальнага кадастравага агенцтва: сёлета трохпакаёвая кватэра ў райцэнтры была прададзеная за 10 тысяч рублёў.**

На выязным пасяджэнні Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта ў Ганцавічах былі агучаны такія факты сацыяльна-эканамічнага становішча раёна: з 27 тысяч яго насельніцтва менш за 10 тысяч чалавек з'яўляюцца эканамічна актыўнымі. А са 170 тысяч гектараў тэрыторыі раёна толькі 20 тысяч гектараў з'яўляецца ворыўнай зямлёй. Таму стандартныя падыходы па вядзенні эканомікі тут непрымальныя — была зробленая высновa.

На пасяджэнні выканкама быў прадстаўлены праект стратэгіі развіцця раёна да 2025 года. **Намеснік старшыні Ганцавіцкага райвыканкама па эканоміцы Артур ГРЫГАРАН** расказаў карэспандэнту «МС», што ўпор зроблены на развіццё сельскай гаспадаркі раёна. У прыватнасці, стратэгія доўгатэрміновага развіцця раёна прадугледжвае развіццё мясной жывёлагадоўлі. У рэгіёне плануецца пабудаваць чатыры малочнатаварныя фермы на 750 галоў — у сельгаспрадпрыемствах «Хатынічы», «Люсіна Агра», «Дубнякі», «Беразавец». Дзеля стварэння больш камфортных умоў для фермераў у сельгаскагаспадарчы зварот плануецца прыцягнуць 680 гектараў зямлі.

Вялікую ролю ў эканоміцы раёна адыгрывае лясная галіна. Работа па забеспячэнні глыбокай перапрацоўкі драўніны выглядае найбольш перспектыўнай. На пасяджэнні прагучала прапанова вывучыць рынак папулярных у насельніцтва каркасных дамоў з бруса, якія сёння экспартуюцца з Расіі.

Ёсць і канкрэтныя зрухі ў развіцці лесаперапрацоўкі прадстаўнікамі малога і сярэдняга бізнесу. Адна прыватная фірма ўжо падала заяўку на атрыманне ўчастка зямлі для размяшчэння прадпрыемства па вытворчасці паліўных гранул. Гэта будзе беларуска-польскае прадпрыемства з прыцягненнем замежных інвестыцый.

Яшчэ, па словах суразмоўніка, Ганцавіцкі хлебазавод плануе стварыць інавацыйную вытворчасць экструзійнай прадукцыі — харчовых пілет. На гэта прадпрыемства выдаткоўвае 1,5 мільёна долараў уласных сродкаў. Яшчэ 370 тысяч мясцовыя хлебапёкі плануюць накіраваць на абсталяванне для вырабу папкорну. Праектныя работы па стварэнні адпаведнай інфраструктуры на прадпрыемстве ўжо вядуцца.

Завод «Модуль» таксама збіраецца пашырыць свой асартымент за кошт мадэрнізацыі вытворчасці пад стварэнне новых відаў прадукцыі. А райвыканкам заклапочаны пошукамі інвестара для будаўніцтва завода па перапрацоўцы малака магутнасцю да 200 тон у год. Яшчэ адной задачай вызначана развіццё аграэкатурызму.

Да разгляду аблвыканкама быў прадстаўлены праект праграмы развіцця раёна. Паводле слоў Артура Грыгарана, зараз ідзе яе канчатковая дапрацоўка з улікам прапаноў і заўваг, выказаных падчас абмеркавання. Выніковы варыянт будзе зацверджаны на сесіі раённага Савета ў лістападзе.

У пасяджэнні аблвыканкама, якое адбылося ў канцы верасня, прымаў удзел **старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.** Ён выказаўся аб неабходнасці крокаў, якія дадуць некаторыя прэферэнцыі, накіраваныя на аздараўленне сітуацыі ў раёне. На думку спікера верхняй палаты, мікраарганізацыі, якія будуць уключаныя ў праграму развіцця, неабходна вызваліць ад праверак на пэўны перыяд. А тым прадстаўнікам малога і сярэдняга бізнесу, якія будуць адкрываць прадпрыемствы для работы на мясцовай сыравіне, неабходна забяспечыць спрошчаны доступ да рэсурсаў, а таксама прадугледзець для іх падатковыя паслабленні.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ВЯЛІКІ ПАТЭНЦЫЯЛ

**Беларусь па праве можна лічыць краінай малых гарадоў. Амаль у 80 % населеных пунктаў нашай краіны пражываюць да 20 тысяч чалавек. Гарадоў, якія прылічаны да сярэдніх — з насельніцтвам ад 20 да 100 тысяч жыхароў, — прыкладна два дзясяткі. Але менавіта гэткія населеныя пункты прадстаўляюць асаблівую значнасць для эканомікі краіны па мностве прычын.**

Па-першае, яны з'яўляюцца цэнтрамі абслугоўвання для шматлікіх вёсак краіны, па-другое — у іх традыцыйна размешчана мясцовая аграрная і аграрна-прамысловая вытворчасць. Акрамя таго, малыя гарады — гэта свайго роду «буферныя» зоны паміж буйнымі ўрбанізаванымі цэнтрамі і прыроднымі комплексамі (запаведнікамі, заказнікамі). Усё гэта пацвярджае, што гарманічнае развіццё краіны магчыма толькі з паступовым ростам патэнцыялу не толькі цэнтраў, але і невялікіх гарадоў.

Формула паспяховага развіцця малых і сярэдніх рэгіёнаў ужо атрымала азначэнне для ўсіх сваіх складнікаў. Адзін з іх — асаблівыя падатковыя ўмовы для вытворчасці, размешчанай у малых населеных пунктах. Эканоміка невялікіх гарадоў менш грунтуецца на сферы паслуг, таму асноўнай галіной з'яўляецца развіццё прамысловасці.

З прыходам бізнесу ў рэгіёны супольна вырашаецца самая важная праблема — рабочыя месцы. «Вось гэта той шлях, калі мы на месцах у невялікіх населеных пунктах, раённых цэнтрах будзем ствараць сучасныя перапрацоўчыя, прамысловыя прадпрыемствы, — адзначыў Прэзідэнт Беларусі падчас рабочай паездкі ў Слуцк на пачатку гэтага года. — Сама абстаноўка і магчымасць атрымаць добрую работу будуць садзейнічаць прызямленню людзей на месцы».

Пра тое, што развіццё сярэдніх гарадоў — адно з ключавых пытанняў парадку дня ўрада, сказала **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА.**

«Была праведзена вялікая работа па развіцці аграгарадкоў, абласных цэнтраў, цяпер ставіцца задача заняцца сярэднімі гарадамі, дзе пражывае больш за 50—80 тысяч чалавек. Трэба паглядзець, як яны развіваюцца, жывуць і працуюць, таму што пераразмеркаванне працоўных рэсурсаў вельмі важнае ў нашай краіне, — заўважыла Наталля Качанава, прадстаўляючы новае кіраўніцтва ўрада ў жніўні. — Трэба выканаць пастаўленыя Прэзідэнтам задачы, каб развіваліся ўсе рэгіёны. Нельга думаць пра тое, што толькі ў Мінск людзі прыедуць і будуць працаваць. Павінны быць высокаэфектыўныя прадпрыемствы ў кожным горадзе і раёне, каб людзі разумелі, што ў іх ёсць работа».

Яшчэ адзін «х» у формуле — гэта інвестыцыі. Напрыклад, у Віцебскай вобласці падрыхтавана спецыяльная праграма, якая прадугледжвае рэалізацыю інвестыцыйных праектаў у кожным раёне на агульную суму каля 6,5 мільярда рублёў. «У вобласці каля 21 тысячы чалавек, не занятых у эканоміцы. Прыкладна палову — 10 тысяч — мы зможам працаўладкаваць пры рэалізацыі гэтых праектаў. Мы вызначылі для сябе цэнтры эканамічнага росту», — расказаў **губернатар Віцебскай вобласці Мікалай ШАРСНЁЎ** падчас

# МАЗЫРШЧЫНА МАЛАДЗЕЕ І ПРЫРАСТАЕ

**Мазырскі раён — адзін з самых буйных у Гомельскай вобласці. Не толькі па плошчы — яна складае 160 тысяч гектараў, але і па наяўнасці горадаўтваральных прадпрыемстваў, якія вызначаюць узровень развіцця рэгіёна ўвогуле і дабрабыту кожнага са 133 тысяч яго жыхароў у прыватнасці.**



**Старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ, дырэктар дзяржаўнай доследнай лесагаспадарчай установы «Мазырскі доследны лясгас» Андрэй МАРАЧКОЎСКІ і старшыня Мазырскага райвыканкама Алена ПАЎЛЕЧКА на тэрыторыі Міхалкаўскага лясніцтва.**

Усе прадпрыемствы вядомыя не толькі на Гомельшчыне, але і ў краіне. Сваімі поспехамі ў эканоміцы, сельскай гаспадарцы, будаўніцтве, грамадскім і культурным жыцці Мазыршчына спрыяе павышэнню аўтарытэту ўсёй краіны. Мазырскі раён уваходзіць у тройку самых буйных прамысловых цэнтраў вобласці. Тут дзейнічаюць 24 прадпрыемствы, якія прадстаўляюць практычна ўсе галіны народнай гаспадаркі: нафтаперапрацоўку, вытворчасць малочных і мясных прадуктаў, солі, машын і абсталявання, кабеляў, швейных вырабаў... Можа, таму жыхары гэтага паўднёвага палескага раёна не шукаюць цяплейшых мясцін пад сонцам? **Старшыня райвыканкама Алена ПАЎЛЕЧКА** нагадвае, што Мазыршчына на вачах маладзее і прырастае:

— Калі раней сярэдні ўзрост складаў 38 гадоў, сёння гэта 32 гады. Калі пяць гадоў таму вясковае насельніцтва ў нас складала крыху больш за 19 тысяч, то сёння гэта амаль 21 тысяча. Акрамя таго, яшчэ 10 гадоў таму былі прыняты меры, каб наша сельская моладзь не ад'язджала ў горад, каб заставалася працаваць там, дзе нарадзілася. Для гэтага былі створаны адпаведныя ўмовы на тэрыторыі сельскіх населеных пунктаў. Мы, дзякуючы ўстойлівай рабоце сельскагаспадарчых арганізацый, пачалі будаваць не толькі дамы сядзібнага тыпу, але і шматкватэрныя. Для моладзі гэта вельмі зручна і камфортна. Мы не закрылі ні адну школу на вёсцы. Наадварот, зрабілі там вельмі добрыя ўмовы для навучання. Доля паступленняў падатковых плацяжоў у раённы бюджэт ад малога і сярэдняга бізнесу складае каля 20 %. Бізнес на Мазыршчыне развіваецца перш за ўсё ў межах горада, прыгарада і ў прамысловай зоне. Палёгкі, прынятыя дзяржавай для яго вядзення, былі вельмі дарэчы. Ну і, канешне, дастойная заработная плата. У сельскай гаспадарцы Мазыршчыны сярэдні заробак складае 982 рублі. У цэлым па раёне 1022 рублі мы ўжо мелі ў верасні.

Адно з прадпрыемстваў, дзе рэнтабельнасць сёння складае 41 %, — Мазырскі доследны лясгас. Яго падчас семінара наведалі дэпутаты Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў і старшыні Саветаў раённага ўзроўню. Тут у будынках лясніцтваў створаны ўсе ўмовы не толькі для работы, але і для адпачынку супрацоўнікаў, чыю штодзённую працу зусім нельга назваць лёгкай і чыстай. Новыя лініі па перапрацоўцы драўніны далі магчымасць стварыць рабочыя месцы, працаваць на экспарт і даць людзям годны заробак.

На тэрыторыі чатырох сельскіх Саветаў (трох — у Мазырскім раёне і адным — у Нараўлянскім) размешчаны землі саўгаса-камбіната «Зара». Сёння гэта шматпрофільнае прадпрыемства добра вядома спажыўцу па канчатковым прадукце найвышэйшай якасці: малако, яйкі, свініна і мяса птушкі, а таксама вырабы з іх можна купіць у фірменных крамах на тэрыторыі ўсёй Гомельскай вобласці. Кіраўніцтва прадпрыемства, дарэчы, змагло ўцягнуць у абарот больш за 30 будынкаў, якія раней не выкарыстоўваліся.

Не саступае гарадскому наладжаны быт больш чым тысячы жыхароў аддаленага ад райцэнтра аграгарадка з развітой інфраструктурай. Сёння «Зара» з'яўляецца шэфам і спонсарам вельмі многіх арганізацый сацыяльнай сферы. У мясцовай школе гавораць, што выпускнікі, калі і адпраўляюцца вучыцца ў іншыя мясціны, практычна ўсе вяртаюцца на малую радзіму, дзе жыць куды больш зручна, чым у любым горадзе. Тут ёсць усё — нават корт для заняткаў вялікім тэнісам. Большасць мясцовых школьнікаў плануюць, як і іх бацькі, працаваць у роднай гаспадарцы. І гэта не дзіўна: сярэдні заробак тут каля 1300 рублёў.

— У прыярытэтах — патрэбы вяскоўцаў, — гаворыць **кіраўнік КСУП «Зара» Алег СЛІНЬКО.** — Напрыклад, вясной у Рудні Міхалкаўскай адкрыўся пабудаваны галоўным чынам на сродкі гаспадаркі новы храм.

Аграгарадок Міхалкаўская Рудня даўно з'яўляецца сапраўдным узорам квітнеючага сельскага населенага пункта. Тут назаўжды і з задавальненнем застаюцца маладыя сем'і і затрымліваюцца маладыя спецыялісты. Некаторыя называюць населены пункт вёскай будучыні, у якой хочацца працаваць і жыць. **Старшыня Мазырскага раённага Савета дэпутатаў Валянціна НАЗАРАНКА** адзначае, што ў Год малой радзімы кожны жыхар павінен адчуваць адказнасць за свой родны населены пункт і імкнуцца яго ўпрыгожыць:

— Мы ў раёне пастаянна праводзім дні сельсаветаў, што стымулюе кіраўнікоў раённых службаў вырашаць праблемныя пытанні на іх тэрыторыі. Пры падрыхтоўцы да іх ва ўсіх населеных пунктах праводзіцца вялікая работа па добраўпарадкаванні. Канешне, тыя прадпрыемствы, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельсаветаў, убаку ад яе не застаюцца. Сумесная работа прыносіць плённыя вынікі.

— Цяпер вельмі актуальныя інавацыйныя падыходы, — гаворыць **старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Кацярына ЗЕНКЕВІЧ.** — Гэта маё дачыненне і да работы Саветаў. Таму мы рэгулярна праводзім выязныя сустрэчы, пільна вывучаем досвед калег на месцах, дзелімся сваім. Рэзервы для павышэння эфектыўнасці нашай работы ёсць не толькі ва ўзмацненні ўзаемадзеяння Саветаў з уладай, але і ў ступені ўзаемадзеяння паміж Саветамі розных узроўняў. Увесь напрацаваны досвед павінен шырока распаўсюджвацца.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Наш фармат

# Фальклор пад караоке

**Этнограф Ларыса МЯТЛЕЎСКАЯ і даследчык беларускага народнага танца Сяргей ВЫСКВАРКА станyць вядучымі новага фальклорнага праекта «Спявае Беларусь», які стартуе ў тэлевізійным эфіры ў лістападзе.**



Здымачная група праграмы плануе наведаць розныя куткі краіны, ад паўночных раёнаў Віцебшчыны да памежных вёсак гомельскага Палесся, каб стварыць своеасаблівую «песенную карту Беларусі». Вядучыя разам з мясцовымі фальклорнымі калектывамі не толькі вывучаць старадаўнія беларускія песні, але і расшыфруюць іх для шырокай аўдыторыі з дапамогай караоке-цітраў. А вядомы фалькларыст Іван Крук дапоўніць спевы займальнымі гісторыямі пра важныя сімвалы вясковага жыцця і звязаныя з імі прыкметы і традыцыі: раскажа, напрыклад, што такое чырвоны кут, ад чаго абараняе падкова ў хаце і дзе павінен стаяць стол...

Першы выпуск праекта ўжо зняты — яго ўдзельнікамі сталі артысты фальклорнага калектыву «Калыханка» з гарадскога пасёлка Міханавічы Мінскага раёна.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Фота прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі.**




# ШАШКІ («ЗВЯЗДА»)

**Выпуск № 74**

З 11 да 17 кастрычніка ў Мінску прайшлі чэмпіянаты Рэспублікі Беларусь (1-я ліга) сярод мужчын і жанчын. У мужчынскім турніры 28 удзельнікаў, сярод якіх 6 майстроў спорту і міжнародны гросмайстар па шашках-64 Яўген Кандрачэнка змагаліся за пяць пуцёвак, якія даюць права на будучы год згуляць у вышэйшай лізе чэмпіянату краіны. Іх уладальнікамі сталі мінскія майстры Андрэй Моўчан, Юрый Цымановіч, Дзмітрый Немец — ва ўсіх па 13 ачкоў; чэмпіёнка Беларусі сярод жанчын Яна Якубовіч і кандыдат у майстры з Жодзіна Сцяпан Дарашэнка — у абодвух па 12 ачкоў. У жаночым турніры за пяць запаветных пуцёвак змагалася 21 шашыстка. Перамагла майстар Паліна Петрусёва — 13 ачкоў. Яшчэ чатыры спартсменкі набралі па 12 ачкоў — кандыдат у майстры Вікторыя Нікалаева, першаразрадніца Вікторыя Белая (Віцебск), кандыдаты ў майстры Дар'я Нікіфарава і Марыя Часнакова (усе — Мінск).

У Ленінскім раёне г. Мінска прайшло першынство раёна па рускіх шашках, прызёрамі сталі: 1. Касцян В., 2. Гурэцкі В., 3. Супрунюк С.

Паглядзіце прыклады гульні ўдзельнікаў спаборніцтваў.

**№ 70** Г. Барышава — К. Кудравец

**Белыя простыя шашкі:** 24, 25, 28, 29, 31, 32, 33, 37, 38, 39 (10).

**Чорныя простыя шашкі:** 9, 10, 12, 13, 14, 15, 16, 18, 21, 26 (10).

1. 2823? Памылка, выйгравала 1.3127, і ў чорных няма карысных ходаў на 1 ... 1217 вартая камбінацыя 2520, 2419, 2920, 2822, 3304+

**№ 71** С. Астапаў — Д. Немец

**Белыя простыя шашкі:** 26, 29, 32, 33, 34, 35, 36, 39, 40, 41, 43, 44, 47, 48, 49, 50 (16).

**Чорныя простыя шашкі:** 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 12, 15, 16, 18, 19, 20, 22, 24 (16).

Чорныя з дапамогай камбінацыі праніклі на дамачнае поле 46. Пакажыце камбінацыю.

Для самастойнага рашэння ў шашкі-64 прапануюцца камбінацыі, складзеныя вядучым аддзела.



**№ 72**

**Белыя простыя шашкі:** b6, c7, e7, f2, h2, h4 (6).

**Чорныя простыя шашкі:** c3, d4, f4, g3, g7, h6 (6).

**№ 73**

**Белыя простыя шашкі:** d2, f4, g1, g5, h2 (5).

**Чорныя простыя шашкі:** b2, b6, d4 (3).

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць.

Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

**Праверце свае рашэнні:** Выпуск № 73 ад 12.10.2018.

№ 67 b2, e3, c5, g3, h8+.

№ 68 1.2419 14x45 2.5044 15x24 3.4440 45x34 4.4238+.

№ 69 1.3227 21x43 2.3430 15x33 3.48x06+.

Дакладныя адказы даслалі В. Дударэвіч (в. Новая Мыш Баранавіцкага раёна), Ф. Карпей (Мядзел), У. Статкевіч (п. Зялёны Бор Івацэвіцкага раёна), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Івянец), В. Ваўчкоў (Маладзечна), П. і В. Шульгі, А. Ліцьвінаў (усе — Мінск), В. Таўкачоў (Клімавіцкі раён), В. Бандарык (Мінскі раён).

Пішыце на адрас: газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## Сядзі і глядзі

# ЦІКАВІНКІ СУПРАЦЬ МАРКОТЫ



### «Дзесяць фатаграфій» «Беларусь 3», з 29 кастрычніка

Нечаканыя фотаздымкі людзей, чые імёны ва ўсіх на слыху, — гэта акцёры і рэжысёры, спартсмены і трэнеры, папулярныя эстрадныя артысты — адкрыюць невядомыя эпізоды з жыцця герояў. Напрыклад, актрыса Наталля Белахвосцікава ўспомніць пра тайнае прызнанне Алена Дэлона, а Аляксандр Міхайлаў раскажа, што ў дзяцінстве крадком еў зубную пасту, а аднойчы падчас здымак ледзь не загінуў з-за гальштука... Акрамя таго, вядучы праграмы Аляксандр Стрыжэнаў рыхтуе для кожнага госця сюрпрыз: рэбус, складзены з карцінак, кожная з якіх абазначае асобную цікавую гісторыю.

### «Каралева прыгажосці» «Беларусь 1», з 29 кастрычніка



Характство вясковай дзяўчыны Кацярыны Пановай дазволіла ёй не проста хутка прабіцца з далёкай правінцыі ў цэнтральны сталічны Дом мод, але і стаць тварам савецкай моды 60-х гадоў і першай манекеншчыцай, якую прызналі на Захадзе, называючы ў тым ліку «нацыянальным здабыткам СССР». Але мала хто ведае, што за вонкавай казкай пра Папялушку схаваныя зайздрасць і інтрыгі, бацькоўская нелюбоў і выпрабаванне славай...



### «Танкі» TV1000Ru, 30 кастрычніка — 4 лістапада

Нягледзячы на ваенную тэму, гэта не гістарычная драма, а хутчэй лёгкае прыгодніцкае кіно з элементамі комікса. Канструктар Міхаіл Кошкін на парозе вайны з Германіяй распрацоўвае прататып інавацыйнага танка Т-34 і, каб даказаць бездакорнасць баявой машыны, разам з аднадумцамі выпраўляецца на ўзорах тэхнікі ў Маскву. Аднак хутка высвятляецца, што бездарожжа — найменшая з праблем на шляху, і выпрабоўваць танкі давядзецца ў баявых умовах...

### «Містар Фелічыта» «Кінакамедыя», 3 лістапада



Лянота нарадзілася раней за італьянца Марціна, які любіць ляжаць на канапе і разважаць пра тленнасць існага. Але каб сабраць грошы на аперацыю для сястры, ён вымушаны ўстаць і ісці працаваць — памочнікам да вядомага псіхолага. Падчас ад'езду доктара Марціна выдае сябе за яго і напачатку зарабляе неблагія грошы, пакуль не сутыкаецца з сапраўды сур'ёзным выпадкам.



### «Вёска. LIVE» СТБ, з 4 лістапада

Гераіня новага рэаліці-шоу ўласнай вытворчасці тэлеканала — модная гараджанка, вакалістка гурта «Лас Вегас» Лізавета Палішчук, якая нічога не ведае пра вясковыя будні, але вымушана акунуцца ў іх. Кампанію ёй складзе Ула-дзімір Субат, які, наадварот, глыбока ведае побыт сельчан і будзе з гумарам каментаваць экспромты, якія адбываюцца ў кадры. У 12 выпусках праекта гледачы ўбачаць, як гарадская прыгажуня паспрабуе асвоіцца на ферме і палетках і навучыцца саліць гуркі, стрыгчы авечку, даіць казу...




# Разынкі на абрусе ў альтанцы

**Штотыдзень у эфіры тэлеканала «Беларусь 3» тэлевіктарына «Размаўляем па-беларуску». Для таго каб стаць яе ўдзельнікамі, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Ну, а праверыць сваё веданне роднай мовы пасля таго, як праграма выйшла ў эфір, можна з дапамогай «Звязды». Ці ведалі вы, што:**

**абру́с** — тэкстыльны выраб, якім засцілаюць стол;

**пачва́ра** — казачная, жудасная істота;

**мармыта́ць** — гаварыць невыразна;

**грэ́баваць** — выражаць агіду да чаго-небудзь;

**разы́нкі** — сушаныя ягады вінаграду;

**альта́нка** — летняя пабудова для адпачынку;

**задаваць тон** — паказваць прыклад у чым-небудзь, станавіцца ўзорам для іншых. Беларускія адпаведнікі: *весці рэй, правіць баль, трымаць лейцы.* Руская: *делать погоду, играть первую скрипку;*

**на жабін скок** — 1) вельмі мала; 2) вельмі малы (па дажыні, плошчы). Беларусы яшчэ скажуць: *з камароў нос, з макава зерне.* Руская: *курам на смех, капля в море.*

**Паўторы выпускаў тэлевіктарыны — у ранішнім эфіры «Беларусь-3» кожную суботу.**

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 0.15** «Зона Х» (16+).
**9.10** «Галоўны эфір».
**10.20, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Каралева прыгажосці» (12+).**
**12.45, 13.05, 14.35, 15.25 Меладрама «Грамадзянка Кацярына» (12+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**21.50** Дак. фільм.
**22.20 Серыял «След» (16+).**
**23.55** «Арэна».
**0.55** «Дзень спорту».

## Беларусь 2

**7.00** «Тэлераніца» (12+).
**9.00, 18.30** «Тэлебарометр».
**9.05, 20.05 Серыял «Зразумець. Дараваць» (16+).**
9.00, 17.00, 23.00, 4.40 Паляўнічыя на склады (16+).
10.00, 15.00, 21.00 Як гэта зроблена? (12+).
11.00, 20.00, 5.30 Склады (16+).
12.00, 1.00, 7.10 Не спрабуйце паўтарыць (16+).
13.00 У пошуках скарбаў (16+).
14.00, 3.50 Востраў (16+).
18.00 Залатая ліхаманка (12+).
19.00 Забытая інжынерыя (12+).
0.00 Як устроены Сусвет (12+).
2.00 Хаос у дзеянні (16+).
2.55 Разбуральнікі легенд (16+).
6.20 Хуткія і гучныя (16+).

# МАЛЫХ ГАРАДОЎ



візіту Прэзідэнта ў Оршу. Патэнцыял мае сфера турызму, стварэнне новых прадпрыемстваў і вытворчасцяў, развіццё перапрацоўкі мясцовых відаў сыравіны, а таксама галіна лесанарыхтоўкі і дрэваапрацоўкі, будаўніцтва транспартна-лагістычных цэнтраў.

Па даных Міністэрства эканомікі, за першае паўгоддзе 2018-га прамыя замежныя інвестыцыі на чыстай аснове (без уліку запазычанасці прамому інвестару за тавары, работы, паслугі) склалі 1,3 мільярда долараў. Але па-ранейшаму асноўны іх прыток выпадае на Мінск — 0,7 мільярда.

Немалаважным для эканамічнага росту з'яўляецца і развіццё інавацыйнага патэнцыялу рэгіёнаў. А гэта цягне за сабой і фарміраванне адукацыйнай супольнасці, транспартнай інфраструктуры і дыверсіфікацыю рынку працы.

Для вырашэння эканамічных праблем спецыялісты прапаноўваюць рэгіёнам прынцып «разумнай спецыялізацыі». Ён прадугледжвае адмаўленне ад дублявання аднастайных прынцыпаў развіцця суседнімі населенымі пунктамі.

Але не ўсё залежыць толькі ад эканомікі. Вялікая роля і ў сацыяльных праектаў. Доступ да медыцынскіх паслуг (колькасць дактароў, забяспечанасць лекамі) у сталіцы і абласных цэнтрах значна вышэйшы, чым у рэгіёнах. Ды і адукацыйныя магчымасці не спрыяюць прывабнасці малых і сярэдніх гарадоў: амаль палова ўсіх ВНУ краіны размешчана ў сталіцы. Наяўнасцю вышэйшых навучальных устаноў сярод рэгіянальных цэнтраў могуць ганарыцца толькі Баранавічы, Полацк, Горкі, Мазыр і Пінск. Таму і атрымліваецца, што большасць маладых кваліфікаваных спецыялістаў застаецца ў працяглых пошуках працы ў Мінску, не жадаючы вяртацца ў родныя рэгіёны, дзе адчуваецца недахоп прафесійных кадраў.

Асабліва надзённа ў Год малой радзімы гучыць пытанне аб рэальным удзеле ў грамадскім жыцці органаў самакіравання. Хто як не мясцовыя дэпутаты ведае ўсе балючыя пункты ў рэгіёне? Удзел шырокай грамадзянскай супольнасці, зацікаўленай у паляпшэнні сітуацыі, павялічыў бы колькасць стратэгій для развіцця і надаў бы штуршок для ініцыятывы мясцовым Саветам.

Падрабязней аб перспектыве малых і сярэдніх гарадоў Беларусі чытайце ў матэрыялах нашых карэспандэнтаў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ІНВЕСТЫЦЫІ, ГРАНТЫ, ІНАВАЦЫІ...

## Гэта тое, на чым растуць раёны Магілёўскай вобласці

**Развіццё малых і сярэдніх гарадоў для Беларусі — гэта патэнцыял для дынамічнага росту эканомікі ўсёй краіны. Пра гэта неаднаразова казаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, гэта закладзена ў дзяржаўныя праграмы і планы сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёнаў. Стаўка робіцца на сучасныя тэхналогіі, малое і сярэдняе прадпрымальніцтва, новыя рабочыя месцы. І калі ў Еўропе малыя гарады ўжо лічацца камфортнымі і прывабнымі для жыцця, то ў Магілёўскай вобласці над гэтым яшчэ старанна працуюць.**

За апошні час вельмі далёка прасунуўся ў гэтым кірунку Крычаў. Нагадаем, гэты горад уваходзіць у спіс населеных пунктаў, дзе Указам № 235 аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна створаны больш камфортныя ўмовы для інвестараў.

У ліпені на тэрыторыі былой вайсковай часці быў запушчаны кітайскі інвестпраект ТАА «Інфэн» па вырошчванні грыбоў, якія збіраюцца пастаўляць на кітайскі і беларускі рынкі. Інвестару бязвыплатна перададзена 30 невыкарыстоўваемых аб'ектаў. Пакуль на прадпрыемстве створана 30 рабочых месцаў, у планах адкрыць яшчэ 50.

Летам у Крычаве быў запушчаны вытворчы ўчастак закрытага акцыянернага таварыства «Легпрамразвіццё» з Бабруйска, якое вырашыла пашырацца ў паўднёва-ўсходнім напрамку. Створана 29 новых рабочых месцаў, прычым працаўладкавацца змаглі не толькі крычаўлянкі, але і жанчыны з навакольных вёсак. Большасць з іх прайшлі перанавучанне ў цэнтры занятасці і атрымалі новую прафесію. Участак спецыялізуецца на пашыве спецыяльнага абутку для супрацоўнікаў буйных газанафтавых кампаній Расіі.

Сёлета ў Крычаве адкрыўся і швейны ўчастак прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Шарм Прэм'ер» — вытворцы расійскай маладзёжнай лініі адзення «Тваё». Пашыў арганізавалі на плошчах філіяла «Крычаўскі завод гумовых вырабаў» ААТ «Белшына». Пакуль тут створана 127 рабочых месцаў, а ўсяго іх будзе каля 350.

За дзевяць месяцаў у Крычаўскім раёне зарэгістравана дзесяць камерцыйных прадпрыемстваў і 89 індывідуальных прадпрымальнікаў. Рост паступленняў у раённы бюджэт ад арганізацый недзяржаўнага сектара эканомікі склаў 108,7 % да такога ж перыяду летась.

А яшчэ Крычаў стаў першым у рэспубліцы «разумным» горадам. Праект распрацаваны сумесна з аб'яднаным інстытутам праблем інфарматыкі НАН Беларусі. Ужо запушчана адзіная дыспетчарская служба з кароткім нумарам 115, у раённай паліклініцы запіс ідзе на электронную чаргу і выдаюць электронныя рэцэпты, а ў школе адзнакі выстаўляюць у электронным дзённіку, новыя тэхналогіі ўкараняюцца таксама ў экскурсійную дзейнасць. Галоўнай мэтай рэалізацыі канцэпцыі «Крычаў — малы разумны горад. Крычаўскі раён. Развіваемся разам» з'яўляецца павышэнне ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва.

— Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі дазволяць нам наўпрост узаемадзейнічаць з супольнасцямі і гарадской інфраструктурай, сачыць за тым, што адбываецца ў горадзе, як ён развіваецца і якія спосабы дазваляюць палепшыць якасць жыцця людзей, — кажа **старшыня Крычаўскага райвыканкама Дзмітрый БАЧКОЎ.** І на пытанне, што трэба для таго, каб сцерці мяжу паміж малымі і вялікімі гарадамі, заўважае:

— Вынік заўсёды залежыць ад таго, як чалавек на сваім рабочым месцы ставіцца да сваіх прамых абавязкаў. Трэба пастаянна павышаць свой узровень, рухацца наперад. Сёння мы актыўна займаемся перанавучаннем людзей і робім стаўку на новыя тэхналогіі. Усё гэта разам дае магчымасць сцерці з часам межы паміж горадам і вёскай.

**Слаўгарад — горад невялічкі,** тут жыве крыху больш за сем тысяч жыхароў, але пра іх актыўнасць ведаюць, напэўна, ва ўсёй краіне. Дастаткова згадаць слаўгарадскіх сыраробаў. Эканамічнаму пад'ёму ў раёне садзейнічае развіццё прадпрымальніцтва і паспяховая работа з прыцягненнем міжнародных грантаў.

— Наш прыватны бізнес сёння актыўна асвойвае сферу паслуг, — адзначае **старшыня Слаўгарадскага райсавета Святлана ЯЗЕРСКАЯ.** — Зараз рэгіструюцца два новыя праекты, накіраваныя на развіццё сельскага прадпрымальніцтва. Адмысловы цэнтр будзе створаны якраз на левабярэжжы ракі Сож, дзе зараз будуецца новы мост. Са з'яўленнем моста адкрываюцца і новыя магчымасці: напрыклад, мы збіраемся развіваць лагістычны кірунак. Наша мэта — даць магчымасць рэалізаваць сябе сельскаму насельніцтву, знайсці сябе на рынку працы і быць запатрабаваным. Вялікія спадзяванні ўскладаюцца на рэгіянальны праект, у якім удзельнічаюць пяць раёнаў. Ён таксама накіраваны на развіццё ініцыятыўнасці сярод мясцовых жыхароў. Будзем вучыць іх пісаць бізнес-планы, шукаць донараў, удзельнічаць у праектах.

Хутка ў Слаўгарадзе пачне працаваць філіял бабруйскага прадпрыемства «Чырвоны харчавік», дзе будзе створана 100 рабочых месцаў, а ў вёсцы Перагон адкрыецца мясаперапрацоўчая вытворчасць.

— Збіраемся ў лістападзе ўвесці ў дзеянне буйны свінагадоўчы комплекс на 24 тысячы галоў, дзе будзе створана 50 рабочых месцаў, — адзначыў **старшыня Слаўгарадскага райвыканкама Канстанцін ЖЫГУЦКІ.** — Плануецца, што са студзеня наступнага года ён ужо пачне працаваць на поўную магутнасць. Плюс робім стаўку на дрэваапрацоўку. На працягу апошніх дзесяці дзён зарэгістравана два новыя прадпрыемствы гэтага кірунку, дзе плануецца адкрыццё 15—20 рабочых месцаў. Дарэчы, акцэнт робім на стварэнне новых высокапрадукцыйных месцаў. Каб людзі маглі атрымаць добрую зарплату і выручка была нашмат большай, чым маем сёння. Да таго ж актыўна развіваем турыстычную галіну.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

### У ТЭМУ

**Старшыня камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Руслан СТРАХАР:**

— Калі меркаваць па той жа зарплаце, іншых эканамічных паказчыках, то, безумоўна, вялікія гарады пакуль працягваюць развівацца больш імклівымі тэмпамі. Становішча ў рэгіёнах вельмі залежыць ад той каманды, якая працуе пад кіраўніцтвам старшыні райвыканкама. Добрымі прыкладамі работы на вынік з'яўляюцца на сённяшні дзень Слаўгарадскі і Крычаўскі раёны. Тут працуюць адначасова па ўсіх кірунках: прыцягваюць міжнародныя гранты, ствараюць новыя прадпрыемствы. І вынікі ёсць.

# Драйверам неабходна паскарэнне

**У Віцебскай вобласці сёлета кожны пяты рубель падаткаў — ад малога і сярэдняга бізнесу. Як канстатуюць у камітэце эканомікі аблвыканкама, летась было больш за 18 %. У недзяржаўным сектары эканомікі занята каля 30 % тых, хто працуе. Мясцовая ўлада назірае добрую тэндэнцыю: адчуваецца, што людзі ўсё больш цікавяцца магчымасцю распачаць сваю справу.**

**Старшыня абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** падчас сесій, выязных пасяджэнняў прэзідыума пастаянна звяртае ўвагу дэпутатаў на неабходнасць спрыяць рэалізацыі дзелавой ініцыятывы. І так званы чалавечы фактар часта ўплывае на прыцягненне інвестыцый. У якасці ўзорнага раёна, напрыклад, Уладзімір Цярэнцьеў не раз прыводзіў Лёзненшчыну. **Старшыня мясцовага райсавета Тамара ДРЫЛЁНАК** зрабіла многае, каб зацікавіць інвестараў. У пакінутым памяшканні каля аўтавакзала размясцілі вытворчасць адзення вядомага беларускага брэнда. Да гэтага яна сама расказала патэнцыйнаму інвестару пра магчымасці, пералічыла плюсы раёна, у тым ліку і блізкасць да Віцебска. Пераканала, карацей кажучы, што выгадна ўкласці грошы можна тут.

Каб развівалася эканоміка такіх невялічкіх райцэнтраў, як Лёзна, заканадаўча замацаваны шэраг паслабленняў. У прыватнасці, каб займацца дробным бізнесам, напрыклад перавозкай грузаў, трэба толькі паведаміць мясцовай адміністрацыі аб гэтым. Для дзяржаўных органаў існуе табу на ўмяшанне ў дзейнасць камерцыйных структур. Таму значна прасцей стала ініцыятыўным грамадзянам арандаваць ці набыць у прыватнасць нерухомасць.

Але нярэдка апошняя не цікавіць пакупнікоў, бо знаходзіцца ў вельмі непрывабным стане. Як канстатаваў **член Савета па развіцці прадпрымальніцтва пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, кіраўнік віцебскай фірмы «Альянспласт» Мікалай СІЛІНАЎ,** тыя, хто толькі пачынае бізнес, наўрад ці купяць стары будынак. Зразумела, каб прывесці яго ў парадак, спатрэбіцца шмат грошай. А ў банку атрымаць крэдыт даволі праблематычна, бо неабходна даказаць, што, калі бізнес прагарыць, будзе чым разлічыцца. Залог маёмасці — для многіх праблема.

Вопытныя бізнесмены сцвярджаюць, што прадпрымальніцтва адчувае зацікаўленасць улады ў плённым супрацоўніцтве.

**Намеснік старшыні камітэта эканомікі Віцебскага аблвыканкама Жанна ШАРАНДА** падкрэсліла, што ад прадпрымальнікаў чакаюць больш актыўнага інтарэсу да дрэваапрацоўкі, вырабу прадукцыі з ільну, вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі. У прыярытэце — выраб інавацыйнай прадукцыі.

Дарэчы, прадпрымальніцтва ў глыбінцы развіта на дастатковым узроўні. Там зарабляюць каля 7,1 тысячы ІП (больш за 35 % ад усіх у вобласці). Плюс зарэгістраваны ў сельскай мясцовасці, малых і сярэдніх гарадах каля 3,5 тысячы фірмаў.

Каб колькасць іх павялічылася, неабходна адкрываць бізнес-інкубатары. Налета ў вобласці іх стане ўдвая больш. У рамках праекта ПРААН «Садзейнічанне эфектыўнай занятасці і самазанятасці насельніцтва ў малых і сярэдніх гарадах Беларусі» іх адкрыюць у Глыбокім і Барані Аршанскага раёна. Дарэчы, адна з мэт праекта — спрыяць таму, каб буйны бізнес, замежныя інвестары не проста вывучалі магчымасці супрацоўніцтва, але каб гэта давала канкрэтныя вынікі.

У паўночнай вобласці ў апошні час адбываецца ўсё больш бізнес-мерапрыемстваў. У іх бяруць удзел прадстаўнікі ўлады, эксперты, пачаткоўцы ў бізнесе. Вопытныя прадпрымальнікі на бізнес-форумах, круглых сталах, канферэнцыях бясплатна кансультуюць тых, хто хоча распачаць сваю справу або выйсці на новы ўзровень.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ЯК «ПАДЦЯГНУЦЬ» СЛАБЫЯ РЭГІЁНЫ?

## Эканамісты ствараюць новую мадэль развіцця сярэдніх гарадоў

**І гэта будуць індустрыяльныя цэнтры. Зараз вядзецца аналіз сітуацыі на месцах, вызначаюцца наяўныя і рэзервовыя магутнасці кожнага горада. Начальнік упраўлення эканомікі Гродзенскага аблвыканкама Андрэй Свірыдаў расказаў, якія гарады рэгіёна могуць стаць індустрыяльнымі цэнтрамі і што для гэтага трэба.**

### Падвесці базу

На праблему развіцця сярэдніх гарадоў звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы падчас сумна вядомага прыезду ў Оршу. Эканамісты ўзяліся за справу і прапанавалі сваю канцэпцыю паляпшэння сітуацыі ў гарадах з насельніцтвам звыш 80 тысяч. У Гродзенскай вобласці пад гэту планку падпадае толькі Ліда. Але ў рэгіёне нямала іншых гарадоў, якія трэба развіваць, адзначыў суразмоўнік. Гэта Смаргонь, Ваўкавыск, Слонім, дзе пражывае па 40—50 тысяч чалавек. Насамрэч увага будзе ўдзелена ўсім гарадам і раёнам.

На сённяшні дзень у кожнага раёна ёсць праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця, якая распрацавана да 2020 года. Яна абнаўляецца, вызначаюцца актуальныя напрамкі. У эканамічным плане гэтыя рэгіёны нельга назваць праблемнымі, лічыць Андрэй Свірыдаў. Яны маюць добрую інфраструктуру і патэнцыял. Нездарма станоўчы вопыт гродзенцаў адзначыў і Прэзідэнт краіны падчас нядаўняга візіту ў Гродна і Гродзенскі раён. Каб гарады развіваліся і надалей, прымаюцца адпаведныя меры.

— Літаральна некалькі месяцаў таму Міністэрствам эканомікі прапанавана канцэпцыя новай праграмы індустрыялізацыі рэгіёнаў. Сутнасць у тым, каб слабыя рэгіёны падцягнуць у развіцці, — падкрэсліў Андрэй Свірыдаў. — Напрыклад, стварыць вытворчыя магутнасці. Бо асноўная праблема такіх сельскіх рэгіёнаў — гэта адсутнасць горадаўтваральных прадпрыемстваў, якія б стваралі падатковую базу раёна.

### Вызначыць магчымасці

Па-першае, будзе праведзена інвентарызацыя тых праектаў, якія рэалізуюцца на тэрыторыі раёна, а таксама з ліку перспектыўных. Такім чынам кожны рэгіён убачыць свае рэсурсы і патэнцыял.

У рэспубліканскі план па індустрыялізацыі ўваходзіць каля дзвюх тысяч праектаў. Суразмоўнік вызначае некаторыя з іх. Напрыклад, у Воранаўскім раёне вырошчваюць больш за іншых бульбу, значыць, можна наладзіць яе перапрацоўку. Зараз пачаўся цікавы праект у Рабдуні: будуецца яўрэйскі цэнтр, значыць, ёсць магчымасць развіваць у будучыні настальгічны турызм. Ці Навагрудскі раён, які стаў цэнтрам ветрапарка ў рэгіёне. Наяўнасць пагоркаў і вышыняў дазваляе развіваць альтэрнатыўную энергетыку. У Бераставіцкім ёсць свідравіна з чыстай пітной вадой, адпаведна, трэба і тут наладзіць вытворчасць. Тым больш што раней яна тут і была. Ці, напрыклад, Ашмяны, прыгранічны раён, можна развіваць транспартную інфраструктуру і лагістыку. І першы аб'ект ужо з'явіўся — хутка транспартна-лагістычны цэнтр тут пачне працаваць.

— Задача кожнага раёна — знайсці сваю адметнасць, — адзначыў Свірыдаў. — Магчыма, прыйдзецца перавесці частку сельскагаспадарчых земель у прамысловыя. Калі зараз не прыняць такія радыкальныя меры, некаторыя раёны могуць ператварыцца ў мёртвую зону, дзе будзе некалькі тысяч насельніцтва, і большая частка — пенсійнага ўзросту. Такія тэрыторыі не змогуць далей развівацца. У нас у вобласці пакуль так востра не стаіць гэта праблема, але некаторыя раёны, такія як Свіслацкі, Воранаўскі, Зэльвенскі, патрабуюць увагі.

### Раздаць стратныя плошчы

Тыя прадпрыемствы, якія працуюць рэнтабельна, і будуць працаваць далей, расказвае эканаміст. Гаворка ідзе аб вытворчасцях, дзе больш страт, чым прыбытку, і мала спадзяванняў, што іх можна ажывіць. Андрэй Свірыдаў прыводзіць прыклад Ваўкавыскага завода дахавых і будаўніча-аддзелачных машын. Некалькі гадоў таму сюды прыйшоў турэцкі інвестар і наладзіў вытворчасць камплектуючых для панэльных радыятараў. Затым да яго цэха далучылі ўвесь завод, але гэта не спрыяла яго выратаванню. Вытворчасць хоць і працуе, але прыбытку ад гэтага няма.

— Лепш разбіваць вялікія плошчы на некалькі частак і прапаноўваць іх розным вытворцам. Магчыма, там і з'явілася б нейкае жыццё, — лічыць Свірыдаў.

Аб тым, што такі падыход можа мець поспех, сведчыць лідскі прыклад. Доўгі час тут прастойваў недабудаваны мясакамбінат. Яго прадалі літоўскай кампаніі ARVI, якая наладзіла цэлы цыкл вырошчвання індыкоў, выпуск мясной прадукцыі, стварыла ўтыльзавод і перапрацоўку мяса-касцявой мукі. Можна прыгадаць і прадпрыемства «Лідсельмаш» па выпуску розных сельгасмашын і агрэгатаў. Пустуючыя плошчы занялі вытворчасцю тых жа радыятараў.

Добры прыклад у Смаргоні, дзе быў стары агрэгатны завод, 150 гектараў зямлі, шмат будынкаў пустых. Паступова аддалі кампаніі «Кранспан». Цяпер ад былога завода засталося 27 гектараў зямлі, а само прадпрыемства пазбавілася пустуючых плошчаў. Замест яго з'явілася новае прадпрыемства, буйны экспарцёр, які робіць значны ўклад у бюджэт, а таксама дае рабочыя месцы з добрай зарплатай. У Смаргоні ёсць цэлы індустрыяльны праспект, які быў пабудаваны ў савецкі час. Зараз вядзецца работа над тым, каб знайсці новага гаспадара. Падчас форуму «Еўрарэгіён «Нёман» у Гродне быў падпісаны дагавор з палякамі аб тым, каб размясціць тут мэблевую вытворчасць. У канцы года з'явіцца новы ўласнік і перспектыва ў гэтай тэрыторыі.

### Зрабіць інфраструктуру

Важнае пытанне — крыніца фінансавання. Часткова гэту праблему дзяржава гатова ўзяць на сябе. Кожны раён шукае ініцыятыву пад сябе, а ўжо вобласць будзе па магчымасці дапамагаць шукаць крыніцы фінансавання. Гэта не будуць бюджэтныя сродкі, падкрэсліў эканаміст. Вырашаць праблемы развіцця рэгіёна за кошт бюджэту — гэта тупік, дарога ў нікуды. Маецца на ўвазе доўгатэрміновы шлях развіцця. Сацыяльныя аб'екты ў любым выпадку трэба здаваць, рабіць дарогі, будаваць жыллё — гэта, вядома, за кошт бюджэту. А вось аб'екты эканомікі павінны ствараца за кошт прыватных інвестыцый.

— Задача ўлад — знайсці інвестараў і запусціць вытворчасць, падтрымаць тыя праекты, якія ўзнікнуць на прыватным узроўні. А з інфраструктурай павінна дапамагчы дзяржава, — адзначае Андрэй Свірыдаў. — Яна не павінна фінансаваць праекты. Як паказвае вопыт, эфектыўнай работы ад гэтага не атрымліваецца, аб чым сведчыць і прыклад з такімі буйнымі заводамі, як шклозавод «Нёман» у Бярозаўцы і «Мастоўдрэў». Іх так і не ўдалося вывесці на рэнтабельную работу.

Дарэчы, і прыватныя кампаніі не заўсёды паспяхова рэалізуюць свае праекты. Але трэба накіроўваць сілы на тое, каб стварыць свае цэнтры эканамічнага росту, як гэта зрабілі ў Смаргоні. Ці так, як развіваецца Шчучынскі раён, куды прыходзяць інвестары з цікавымі праектамі. У прыватнасці, нядаўна тут з'явілася першая ў вобласці фабрыка па вырошчванні шампіньёнаў.

— У першую чаргу важна стварыць базісные прадпрыемства, на аснове якога будзе развівацца ўсё астатняе: транспарт, сфера паслуг, гандаль, — падкрэсліў Свірыдаў. — Але інвестару важна, каб былі камунікацыі, інжынерная інфраструктура. Без гэтага праблемна развіваць тэрыторыі.

Падобная сітуацыя склалася ў Свіслацкім раёне. Быццам бы ўключылі ўчасткі ў СЭЗ, ёсць інвестары, якія гатовы наладзіць вытворчасць, але не задавальняе інфраструктура — не пракладзены дарогі, няма спрыяльных умоў для працы.

### Прывабіць інвестараў

Трэба працаваць з замежнымі інвестарамі, лічыць эканаміст. Любая кампанія — гэта іншы погляд на бізнес, эканоміку, іншыя падыходы. У Гродзенскую вобласць ідуць расіяне, нядрэнна ўладкаваліся польскія інвестары, немцы, аўстрыйцы. Але гэта не значыць, што няма добрых беларускіх прадпрыемстваў.

Для бізнесу галоўнае — стабільнасць. І такі фактар тут прысутнічае. Ільгот насамрэч хапае. Так, з наступнага года мяняецца Падатковы кодэкс, у якім прадугледжаны істотныя змяненні, што таксама спросцяць інвестыцыйны працэс. Па новых аб'ектах, якія будуць уведзены ў эксплуатацыю, знізіцца стаўка на нерухомасць.

— Усіх палохалі павышаючыя каэфіцыенты. Яны не давалі развівацца буйным прамысловым прадпрыемствам. З наступнага года па новых аб'ектах падатковая нагрузка будзе ўзрастаць паступова, а не адразу. Бо атрымліваецца, што ты толькі адкрыў свой бізнес, не паспеў выйсці на абароты, а цябе абкладваюць па максімуме мясцовымі падаткамі. Гэта сітуацыя зменіцца на карысць прадпрымальніка, — запэўніў Андрэй Свірыдаў.

Пакуль складана сказаць, на які перыяд разлічана праграма індустрыялізацыі. Вядома толькі, што напрацоўкі павінны быць да 2025 года. Упэўнена работа будзе весціся цэнтралізавана. Гэта надасць сістэмнасць, у тым ліку і па пошуку інвестараў, каб правільна размяшчаць вытворчыя сілы.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**


**РУП «Торговый дом «Восточный»**
**извещает о проведении 28.11.2018 открытого аукциона**
**по продаже недвижимого имущества**

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инвентарным номером 342/D-118528, общей площадью 265,3 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, м-н Березина, 51-1. Назначение: торговое помещение, наименование: магазин № 1. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 325050100002004073 площадью 0,2584 га. **Начальная цена продажи – 164 160,00 рублей, задаток – 16 416,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/C-78250, общей площадью 64,4 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Брестский р-н, Мотыкальский с/с, СТ «Удачное», д. Скоки, 25. Назначение: садовый, дачный домик (дача), наименование: садовый домик. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 121283000015000053 площадью 0,0600 га. **Начальная цена продажи – 26 100,00 рублей, задаток – 2 610,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Капитальное строение с инвентарным номером 311/C-33099, общей площадью 156,1 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Добруш, ул. Полевая, 26А. Назначение: пункт техобслуживания (моечная), наименование: пункт техобслуживания (моечная). Расположено на земельном участке с кадастровым номером 321250100003001252 площадью 5,2719 га. **Начальная цена продажи – 37 800,00 рублей, задаток – 3 780,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Изолированное помещение с инвентарным номером 250/D-31572, общей площадью 98,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Успенская, 3-1. Назначение: помещение транспортного назначения, наименование: гараж на две автомашины. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 223850100004001322 площадью 0,0349 га. **Начальная цена продажи – 10 260,00 рублей, задаток – 1 026,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Изолированное помещение с инвентарным номером 250/D-31573, общей площадью 176,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, ул. Успенская, 3-2. Назначение: помещение, не относящееся к жилищному фонду, наименование: бытовое помещение цеха. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 223850100004001322 площадью 0,0349 га. **Начальная цена продажи – 20 628,00 рублей, задаток – 2 062,80 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Изолированное помещение с инвентарным номером 250/D-32343, общей площадью 519,3 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Полоцк, пр-т Франциска Скорины, 37а-3. Назначение: помещение многофункциональное, наименование: помещение компрессорной станции с административным отделом главного механика. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 243500000004000373 площадью 0,3011 га. **Начальная цена продажи – 61 344,00 рублей, задаток – 6 134,40 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7024545, общей площадью 660,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Старовиленская, 100-4. Назначение: административное помещение, наименование: административное помещение. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000008003305 площадью 1,6161 га. **Начальная цена продажи – 708 480,00 рублей, задаток – 70 848,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Капитальное строение с инвентарным номером 110/C-82934, общей площадью 22,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Фроленкова, 190/29, блок 4. Назначение: здание специализированное автомобильного транспорта, наименование: гараж. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 141000000003000850 площадью 4,8088 га. **Начальная цена продажи – 2700,00 рублей, задаток – 270,00 рублей. Шаг аукциона – 5 %.**

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов) – Претендент на покупку, не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством РБ.

**Аукцион состоится 28.11.2018 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал.**

Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001, БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002 г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом 28 ноября 2018 года.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 14А, управление реализации недвижимости и арендных отношений в рабочие дни: пн. – чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. Окончание приема заявлений – 23.11.2018 в 14.00.

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию департамента в любое время до объявления его проданным.**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 351 00 01; +375 17 380 27 37; +375 44 763 62 63**

# САМ НЕ ГАМ І ДЗЯРЖАВЕ НЕ ДАМ

## Менавіта гэтым прынцыпам кіруюцца асобныя ўладальнікі прыватных пабудоў, якія ім дасталіся ў спадчыну

**Такіх трухлявых будынкаў не вельмі многа, але менавіта яны мімаволі прыцягваюць позірк: сярод поля, на месцы якога яшчэ нядаўна была вёска, стаіць самотная пабудова ў зарасніках. Але ж кіраўнікі сельвыканкамаў гавораць: не маем права знесці — без дазволу ўладальніка. А апошніх між тым шукаюць днём з агнём. Пры дапамозе запытаў да праваахоўнікаў, апытанняў былых суседзяў і нават карпатлівага вывучэння сацыяльных сетак.**




**Падагульненне работы пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце, фінансах і камунальнай уласнасці Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў у Веткаўскім райвыканкаме.**

Такім чынам, старшыні сельвыканкамаў становяцца дэтэктывамі па сумяшчальніцтве. Пра гэта ў Веткаўскім раёне яны і расказвалі членам пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце, фінансах і камунальнай уласнасці Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў. Галоўнай тэмай выязнога пасяджэння стала эфектыўнае выкарыстанне зямельных участкаў пасля зносу старых і пустуючых будынкаў.

Веткаўскі раён — адзін з тых, якія пасля чарнобыльскай аварыі ўвайшлі ў лік асабліва пацярпелых. Адсюль з'ехала каля паловы ўсяго насельніцтва, а назвы шасці дзясяткаў вёсак былі ўвогуле выкраслены з карты.

Між тым райцэнтр Ветка знаходзіцца настолькі блізка ад Гомеля, што мясцовыя жыхары ездзяць на працу ў абласны цэнтр. І наадварот: многія гамяльчане штодзень накіроўваюцца сюды на работу. Іх можна зразумець: даўжэй будзе дабірацца ў Гомелі з аднаго канца горада на другі, чым за 20 хвілін на маршрутцы да Веткі.

У асобных населеных пунктах, напрыклад у Хальчы, — заможныя загарадныя дамы, уладальнікі якіх тут жывуць пастаянна, а бізнес вядуць у Гомелі. Вёска Хальч стаіць па-над Сожам, і адсюль адкрываюцца надзвычай маляўнічыя краявіды. Да таго ж яна знаходзіцца непасрэдна на аўтатрасе. А да Веткі дабрацца — пешшу мост перайсці.

**Старшыня Веткаўскага раённага Савета дэпутатаў Віктар МАСЯЙКОЎ** гаворыць, што менавіта наяўнасць ракі, як і ў старажытныя часіны, сёння вызначае лёс населенага пункта: будзе ён жыць і развівацца ці сыдзе ў гісторыю. І застанецца памяць пра яго толькі ў выглядзе экспанатаў славутага на ўсю краіну Веткаўскага музея стараабрадніцтва і беларускіх традыцый.

Такім чынам, дзякуючы рацэ Сож у Хальчы сёння жыве больш за 700 чалавек. Тут пракладзены газаправод з водаправодам, ёсць базавая школа, садок, папулярныя аграсядзібы. Участкі, на якіх трухлявыя пабудовы зносяцца (такі лёс спасціг сталовую, майстэрні, лагер адпачынку), тут жа купляюцца з аўкцыёну. Набываюць маладыя сем'і — каб будаваць дамы з перспектывай тут жыць доўга і дзетак нараджаць. Аналагічная карціна ў аграгарадку Радуга, дзе 270 дамоў, а ў мясцовай школе вучыцца 129 школьнікаў.

У вёсцы Баркі — усё па-іншаму. **Старшыня Данілавіцкага сельвыканкама Уладзімір ШАПАРАЎ** адзначае, што гэты невялічкі населены пункт выратавалі прадпрымальнікі. Тут засталося дзевяць домаўладанняў, а 17 гектараў зямлі цяпер належаць фермерскай гаспадарцы «Грын Валей». За шэсць гадоў Дзмітрый Хамякоў і Уладзімір Мамачкін пабудавалі тут бізнес, у які ўцягнулі і мясцовае насельніцтва. Пяць чалавек працуюць трывала, і вельмі шмат прыцягваецца да сезонных работ. Дарэчы, цяпер актыўна ідзе раскарчоўка зараснікаў. На месцы, дзе ад іх пазбавіліся некалькі гадоў таму, стаяць блакітныя елкі ў кадках, ядловец, туі, дурніцы і шмат іншых прыгожых раслін, якімі звычайна ўпрыгожваюць паркі, скверы і заможныя сядзібы. Дарэчы, большасць фермерскай прадукцыі арыентавана на экспарт. Расія граніччыць з Веткаўскім раёнам, і дэкаратыўныя дрэўцы там карыстаюцца вялікім попытам.

У вёсцы Замосце сёння 10 дамоў і пяць жыхароў. 20 домаўладанняў знесена, і ўсе гэтыя землі ўведзены ў севазварот. Вось тут дэпутаты бачаць прыклад неашчаднасці ўладальніка нейкай развалюхі, у якой, між іншым, ён зарэгістраваны афіцыйна. Сам не жыве і парадак вакол хібары не наводзіць.

> Праблемныя пытанні датычацца толькі тых дамоў, што знаходзяцца ў цэнтры асобных вёсак. Там, дзе землі не прылягаюць ні да сельгаспрадпрыемстваў, ні да лясной гаспадаркі.

— Мы з такімі пастаянна працуем, — уздыхае старшыня сельвыканкама.

А гэта значыць, чалавеку пішуць бясконцыя прадпісанні. Іх уздзеянне на сумленне, дарэчы, заканчваецца па-рознаму. Адны нарэшце ўсё ўзважваюць і афіцыйна адмаўляюцца ад уласнасці. Іншыя ў апошні момант перад судом вырашаюць, што яна ім усё ж спатрэбіцца, і кідаюцца тэрмінова наводзіць парадак. Асобныя (нават з-за мяжы) прыязджаюць сюды, толькі каб апошні раз паглядзець на радзіму продкаў, — і застаюцца назаўсёды. Радавы маёнтак абуджае пачуцці, і тады сядзіба ажывае.

— У вёсцы Прысно, дзе амаль паўтысячы чалавек, дастаткова праблемных дамоў, — гаворыць **старшыня Прыснянскага сельвыканкама Леанід КСЯНДЗОЎ**, — але і тут многія прыстасавалі бацькоўскую спадчыну пад дачы. А вось побач, у вёсцы Барчанкі, знесены 52 домаўладанні. А гаспадара вось гэтага закінутага дома наводшыбе пакуль вышукваем і адначасова рыхтуем дакументы ў суд. У Аднаполлі сёння 13 пастаянных жыхароў, а астатнія, амаль паўсотні, — дачнікі. Усе ўчасткі пад знос выкуплены, і дамы будуюцца.

Тут Сож таксама побач, і транспарт ходзіць без праблем. Ідылічны малюнак разбураюць толькі асобныя праблемныя пабудовы, вакол якіх акуратна ўзараная на зіму ралля. Але ж, запэўнівае прадстаўнік мясцовай улады, налета плануюць завяршыць работу з такімі закінутымі дамкамі.

У вёсцы Шарсцін дарога ідзе ўздоўж грушавай алеі. Прыгажосць, некалі штучна створаная, дадае праблемы мясцовым жыхарам, заўважае **старшыня Шарсцінскага сельвыканкама Святлана ЦІМОХАВА**:

— Аднак насельніцтва само глядзіць за вялізнымі дрэвамі (іх звыш 450), збірае плады і прыбірае навокал па ўсёй гэтай шырокай і доўгай вуліцы. Тут у нас за пяць гадоў знесена 65 дамоў. Толькі сёлета — 11, два ўчасткі былі прададзены пад дачы. Некаторыя людзі пакідаюць дамы ў горадзе і на пенсіі прыязджаюць жыць у вёску.

— Работа, як бачыце, вядзецца, — падагульняе старшыня Веткаўскага раённага Савета дэпутатаў Віктар Масяйкоў. — Сёлета 20 гектараў уцягнута ў севазварот. Хоць не ўсё і не заўсёды атрымліваецца адразу. Што датычыцца Веткі, то ўсе аб'екты, якія былі знесены, цалкам забудаваны ці забудоўваюцца. За апошнія два гады ў Ветцы, на тэрыторыі, якая некалі належала вядомаму дзяржаўнаму прадпрыемству, потым была перададзена ў камунальную ўласнасць, зараз пабудаваны жылы мікраараён і аб'екты гандлю. Там і цяпер працягваецца будаўніцтва. Праблемныя пытанні датычацца толькі тых дамоў, што знаходзяцца ў цэнтры асобных вёсак. Там, дзе землі не прылягаюць ні да сельгаспрадпрыемстваў, ні да лясной гаспадаркі. Наша задача — знайсці ўласніка зямлі і зрабіць усё, каб яна не пуставала. Сёлета мы ў раёне знеслі 79 домаўладанняў. Плануем, што да канца года іх будзе каля сотні.

— Павінен быць гаспадар, які працуе на зямлі, — упэўнены **начальнік землеўпарадкавальнай службы Гомельскага аблвыканкама Аляксандр МАТАРАС**. — Мы пабачылі і станоўчыя, і адмоўныя прыклады. Ёсць кантраст паміж асобнымі суседнімі сельсаветамі. І ўсё таму, што недзе не працуе звязка «кіраўнік сельгасарганізацыі — старшыня сельсавета»: яны дзеляць, хто што павінен рабіць, замест таго каб працаваць разам. Аднак радуе, што тыя кіраўнікі, якія гэтай тэмай займаюцца сур'ёзна, разумеюць, як гэта павінна быць. Мы, калі думаем, для якіх мэт выкарыстоўваць тыя ці іншыя зямельныя ўчасткі, прыярытэт аддаём сельскай гаспадарцы, таму што гэта самы эфектыўны спосаб выкарыстання зямлі. Ён патрабуе мінімум затрат на падтрыманне парадку і дае максімальны эканамічны эфект. Другі варыянт выкарыстання такіх зямель — перадача пад лесапаркавыя зоны, азеляненне, добраўпарадкаванне, устаноўку малых архітэктурных формаў. Калі населены пункт перспектыўны і зямельныя ўчасткі карыстаюцца попытам у насельніцтва, выдзяляем для будаўніцтва і абслугоўвання індывідуальных жылых дамоў ці для вядзення асабістай гаспадаркі. Паколькі мы больш за 10 гадоў займаемся гэтай тэмай, асноўныя праблемы вырашылі. Засталося скончыць тое, што недзе не дарабілі.



**На месцы зараснікаў — дэкаратыўныя дрэвы фермерскай гаспадаркі «Грын Валей».**

Як адзначыла **старшыня пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце, фінансах і камунальнай уласнасці Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Антаніна ЯЖОВА**, уцягванне ў гаспадарчы абарот земляў, якія не выкарыстоўваюцца, станоўча ўплывае на сацыяльна-эканамічнае развіццё кожнага рэгіёна. Таму сумесная работа органаў мясцовага кіравання і самакіравання, а таксама ўсіх устаноў і арганізацый па добраўпарадкаванні і навядзенні парадку на зямлі будзе працягнута:

— Я тут, у Веткаўскім раёне, нарадзілася. Раней мне было цяжка бачыць, як усё разбуралася. А цяпер іншая карціна. Калі дамы зносяцца, значыць, участкі прадаюцца. Сапраўды наводзіцца парадак на зямлі. Знесена шмат пабудоў рознай формы ўласнасці, якія не выкарыстоўваліся. Радуе тое, што не толькі зносіцца трухлявае, але на гэтым месцы будуецца новае. Ідзе паступовае адраджэнне аграгарадкоў і вёсак, адраджэнне нашых каранёў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## АЎТАЛАЎКА БОЛЬШ НЕ ПАЕДЗЕ

**У рэдакцыю «Хойніцкіх навін» звярнуліся жыхары вуліцы Краснаніўскай райцэнтра з пытаннем, чаму як раней не ездзіць аўтамагазін райспажыўтаварыства. Ім, грамадзянам сталага ўзросту, цяжка дабірацца нават да размешчанага непадалёк "Еўраопта».**


www.hoiniki.by

Як растлумачылі ў райспажыўтаварыстве, у сувязі з нерэнтабельнасцю ўсёй работы аўтамагазінаў у раёне іх колькасць зменшана, а маршруты размеркаваны такім чынам, каб ахапіць населеныя пункты, дзе няма стацыянарных магазінаў і дзе яшчэ не ездзяць аўтамагазіны сеткі «Еўраопт». Аднаўляць работу аўталаўкі па вуліцы Краснаніўскай не плануюць.

У аддзеле эканомікі райвыканкама адзначылі, што «Еўраопт» пакуль што не плануе адкрываць новыя маршруты, у прыватнасці ў межах горада.

## ШМАТДЗЕТНАЯ МАЦІ ЗАКЛІКАЕ ЗБІРАЦЬ СМЕЦЦЕ Ў ЛЕСЕ

**Лагайчанка Таццяна Кісялёва на сваіх старонках у сацсетках кінула кліч, каб знайсці ахвотных прыняць удзел ва ўборцы лесапаласы ў раёне вуліцы Мінскай. На жаль, пакуль ніхто не адгукнуўся.**


www.logoysk.by

Рэдакцыя раённай газеты «Мой родный край» звязалася з аўтарам паслання. Як высветлілася, такое рашэнне ў шматдзетнай мамы паўстала пасля таго, як у мясцовай гімназіі, дзе вучыцца адна з яе дачок, папрасілі сабраць пластык. З пастаўленай задачай сям'я справілася.

Але дзесьці за год да гэтага Таццяна на сайце www.ecoidea.by прачытала пра тое, што сярод школьнікаў праходзіў конкурс «Хто больш збярэ смецця — паедзе ў Ельню!». Тады паўдзельнічаць у ім не атрымалася, таму сёлета лагайчанка вырашыла ўзяць рэванш. Так, сапраўды, у нашай краіне з 5 да 31 кастрычніка праходзіць спаборніцтва па ўборцы смецця, але ўжо не сярод вучняў школ, а сярод студэнтаў. Камандам неабходна будзе сабраць як мага больш смецця ў лясах, на берагах вадаёмаў і ў зялёных зонах гарадоў. Якое дачыненне ўсё гэта мае да сям'і Кісялёвых?

Проста ў іх старэйшая дачка ўжо студэнтка. Вось мама і спрабуе сабраць каманду сярод лагайчан, каб паўдзельнічаць у конкурсе. Пераможцаў, між іншым, чакаюць сувеніры, а гораду ад гэтага будзе вялікая карысць. Далучайцеся!

## ЗАМЕСТ СПАРАХНЕЛАГА ДОМА — НОВЫ ПАРК

**На свяце аграгарадка Вархі, які арганізавалі па ініцыятыве сельвыканкама і мясцовага СДК, жыхары не толькі павесяліліся і адпачылі, але і ўсе разам, ад малога да вялікага, паўдзельнічалі ў акцыі «Пасадзі дрэва».**


www.garadvest.by

На месцы знесенага састарэлага дома заклалі парк, у якім высадзілі 16 маладзенькіх хвоек, аб чым паведамляе «Гарадоцкі веснік».

Разам з сацработніцай Ганнай Галубцовай пасадзіў сасну Іван Сцесеў *(на здымку)*.

А яшчэ былі падведзены вынікі конкурсу на найлепшае добраўпарадкаванне па аграгарадку ў намінацыі «Найлепшая сядзіба — 2018». Падзячны ліст сельвыканкама і каштоўны падарунак уручылі пераможцы — Але Дзергачовай.

**Падрыхтавала Вольга АНУФРЫЕВА.**

# МАЛОЙ РАДЗІМЫ ПРЫЦЯЖЭННЕ

## Ці здзейсняцца юнацкія мары?

**19 кастрычніка каля Залескай сярэдняй школы, што на Смаргоншчыне, урачыста адкрылася пляцоўка вулічных трэнажораў, створаная ў межах праекта «Будучыня — гэта мы», што атрымаў фінансавую падтрымку, як пераможца конкурсу міні-грантаў. Пасля адкрыцця новай спартыўнай пляцоўкі адбылася прэзентацыя веламаршруту «Невядомая вайна вачыма нашчадкаў» па тэрыторыі Залескага сельскага Савета.**

А напярэдадні кіраўнік праекта Ала Шыцікава сустракалася са старшакласнікамі, каб даведацца, як яны сабе ўяўляюць камфортнае пражыванне ў аграгарадку і чаго ім не хапае для гэтага камфорту. На пытанне, хто хоча застацца на малой радзіме пасля заканчэння сярэдняй школы, толькі адзін чалавек адказаў станоўча. Шчыра прызнаюся, у мяне на душы пахаладзела: калі нават тут, у слынным аграгарадку, вядомым сваімі гістарычнымі помнікамі, якія прыцягваюць штогод сотні турыстаў да садова-паркавага комплексу Міхала Клеафаса Агінскага, не хоча заставацца моладзь, то што казаць пра іншыя мясціны, пазбаўленыя культурна-гістарычных і прыродных помнікаў? Залессе — даволі буйны чыгуначны вузел, ёсць тут прадпрыемствы аграрнага і дрэваапрацоўчыя, на невялікай адлегласці сілікатабетонны завод і да Смаргоні рукой падаць. Але спакушальныя агенчыкі сталіцы прыцягваюць больш, чым мясцовыя рарытэты і не самыя аптымістычныя перспектывы.

> Праект «Будучыня — гэта мы» дзейнічае да канца бягучага года. Аднак планаў і задум ў мясцовых дзяўчат і юнакоў яшчэ шмат. Яны з энтузіязмам бяруцца за справу, бо для іх святло сталічных агеньчыкаў стала не такім спакушальным, як прыцягненне роднай зямлі.

Толькі дзевяцікласнік Ягор Спаскі выказаў жаданне застацца на малой радзіме. Дарэчы, і ў пераліку прыярытэтаў для камфортнага пражывання ў правінцыі прапановы юнака вылучаліся сур'ёзнасцю і скіраванасцю на сацыяльна-эканамічнае развіццё Залесся. На такіх юнакоў і робіць стаўку Ала Шыцікава пры здзяйсненні сваіх чарговых праектаў, накіраваных на спрыянне ўстойліваму развіццю сельскіх тэрыторый. Падчас сустрэчы ў мясцовай школе шасцёра вучняў, сярод якіх і Ягор, былі абраны прадстаўнікамі ў маладзёжнае самакіраванне, што створана пры Залескім савеце дэпутатаў. Працоўная моладзь і старшакласнікі будуць не проста прадстаўляць інтарэсы сваёй супольнасці, але і асвойваць асновы дзяржаўнага кіравання. Самыя актыўныя юнакі і дзяўчаты яшчэ летам далучыліся да праектнай дзейнасці. Гэта іх рукамі пры садзеянні дырэктара школы Канстанціна Грудзіны ўсталявалі сем вулічных трэнажораў, добраўпарадкавалі навакольную тэрыторыю.



У межах праекта распрацаваны веласіпедны турыстычны маршрут па мясцінах памяці аб Першай сусветнай вайне. Восем веласіпедаў, набытых за грошы праекта, — першапачатковы ўнёсак у справу папулярызацыі гістарычнай спадчыны, якую да гэтага абыходзілі ўвагай турысты, наведваючыся пераважна ў музей-сядзібу Міхала Клеафаса Агінскага. Першы велапрабег, што адбыўся ў суботу, меў на мэце яшчэ і прыцягненне мясцовай моладзі да добраўпарадкавання тэрыторый побач з помнікамі так званай Мікалаеўскай вайны і на старажытных могілках, дзе ёсць пахаванні ваеннага ліхалецця.

З тым, як працуе маладзёжнае самакіраванне ў суседняй Польшчы, прадстаўнікі Залесся знаёміліся падчас паездкі на святкаванне 40-годдзя творчага калектыву «Нараўчанкі». Сяброўскія стасункі з гэтым ансамблем з Нараўкі падтрымліваюцца на працягу доўгіх гадоў, з таго першага спаткання на фэсце «Залессе запрашае сяброў», што паклала пачатак творчым стасункам. Сёлета пры падтрымцы старшыні сельвыканкама Зянона Грышкевіча адбылася паездка ў Польшчу, у выніку якой падпісана дамова аб супрацоўніцтве маладзёжных фарміраванняў дзвюх краін. Ёсць намер сумесна паўдзельнічаць у конкурсе трансгранічнага супрацоўніцтва. Народнае музычнае мастацтва рэгіёна вельмі паспяхова прадстаўляў на фэсце новы творчы калектыў настаўнікаў Залескай музычнай школы «Бліскавіца».

Праект «Будучыня — гэта мы» дзейнічае да канца бягучага года. Аднак планаў і задум у мясцовых дзяўчат і юнакоў яшчэ шмат. Яны з энтузіязмам бяруцца за справу, бо для іх святло сталічных агеньчыкаў стала не такім спакушальным, як прыцягненне роднай зямлі.

**Ала КЛЕМЯНОК.**
**Фота аўтара.**


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 25 кастрычніка 2018 года.**